№ 35 (585) 25 верасьня 2008 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі

**Экспэрымэнтальныя акругі ўлады**

Ёсьць рэгіёны, дзе выпрабоўваюцца «новыя тэхналёгіі».

Старонка 3

**Капіталізм і ягоныя крызісы**

Крызісы патрэбныя капіталізму як соль — супу.

Старонка 5

**Канец шасьцідзясятніцкіх ілюзій**

Выявілася, што людзям не патрэбная ўся праўда, калі ім жывецца добра. Піша Віталь Тарас.

Старонка 11

У НУМАРЫ

**Аптымізм Эўропы не заменіць нам Беларусі**

Выгадныя кантракты для эўрапейскіх кампаній не прывядуць да аднаўленьня палітычных і культурных свабодаў у нашай краіне аўтаматычна. Піша Андрэй Павач. **Старонка 5.**

**Катарсіс на «Дажынках»**

Б’емся за ураджай з дапамогай «джон дзіраў» зь «бізонамі», а дажынкі сьвяткуем па-пацёмкінску. **Старонка 8.**

**Літсправаздача за сто гадоў**

«Галасы з-за небакраю»: шырокія і вузкія месцы беларускага паэтычнага перакладу. Піша Павал Касьцюкевіч. **Старонка 6.**

**Зь юбілеем, Белаазёрск!**

Рэпартаж Сямёна Печанка. **Старонка 14.**

**Царыца Ізраілева**

Цыпі Ліўні: новая прэм’ерка Ізраілю. Былы агент «Масаду». «Супэржанчына». Дачка выхадца зь Беларусі. **Старонка 12.**

**Дыскаграфія**

Джамбібум — здольны ўвесьці ў транс. Сярога — нібы прытаміўся. Merry Poppins — нягледзячы на... **Старонка 7.**

# Усе бяз выбару

Парлямэнцкія выбары–2008 будуць самымі безальтэрнатыўнымі ў найноўшай гісторыі краіны. Аднак яны маюць усе шанцы стаць першымі прызнанымі. **Старонка 3.**



Юлія Дарашкевіч

**Выбарчы ўчастак у часткі ўнутраных войскаў, што ў сталіцы на Маякоўскага.**

# Дзіўныя кандыдаты

Па выніках рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты вымалёўваецца адна заканамернасьць — па многіх акругах, дзе ідзе вядомы апазыцыйны лідэр, апроч прадстаўніка ўлады вылучаецца яшчэ адзін ці некалькі досыць дзіўных кандыдатаў. Як правіла, гэтыя людзі прыкладна аднаго ўзросту з кандыдатам ад апазыцыі і займаюць падобныя пасады.

Мяркуйце самі. Ва Ўручанскай акрузе Менску, дзе балятуецца былы намесьнік старшыні Партыі БНФ Алесь Міхалевіч, вылучаны таксама амаль ягоны аднагодак з ЛДП бізнэсовец Сяргей Тарлюк.

Да лідэра ПКБ Сяргея Калякіна ў Коласаўскай дадалі маладога камуніста з праўладнай КПБ Юр’я Васкрасенскага.

Да старшыні БСДП Анатоля Ляўковіча ў Берасьці прыставілі намесьніка дырэктара ААТ «Кравіра і К» Барыса Гасана.

Разам з салдатам тэрміновай службы Віталём Каратышом па Лунінецкай акрузе балятуецца настаўнік адной зь мікашэвіцкіх гімназій (толькі на год старэйшы за прадстаўніка БНФ), а таксама начальнік юрыдычнай службы в/ч 65408.

Яшчэ больш цікавая сытуацыя ў Гарадзенскай-Цэнтральнай акрузе, дзе ад АДС ідзе старшыня арганізацыі Беларускага незалежнага прафсаюзу работнікаў «Гродня-Азот» Сяргей Антусевіч. У процівагу яму вылучылі яшчэ аднаго супрацоўніка «Азоту» Аляксандра Мікалуту. У кандыдатаў па ўзросьце ўсяго год розьніцы.

З 33-гадовым Віталём Рымашэўскі з БХД па Адзінцоўскай акрузе вылучаецца 29-гадовы індывідуальны прадпрымальнік Юры Шаблін, а таксама 25-гадовы повар «Бітлз-кафэ» Яўген Трыгубко.

Выглядае, што вылучэньне многіх з гэтых людзей накіраванае на тое, каб адабраць частку галасоў у апазыцыйных кандыдатаў.

**Зьміцер Панкавец**

**Плошча**

**На апошнім пасяджэньні Палітрады АДС таксама было прынятае рашэньне заклікаць да вулічнай акцыі пратэсту 28 верасьня на Кастрычніцкай плошчы. Там абяцаюцца быць усе палітычныя лідэры апазыцыі.**

**Прызнаньне**

На адной з апошніх прэс-канфэрэнцый старшыня БНФ Лявон Баршчэўскі наракаў, што апазыцыя ўдзельнічае ў выбарах да канца ў тым ліку па просьбах замежных партнёраў. Ці ня гэта самы яскравы прыклад, што Захад гатовы, хай і абмежавана, але прызнаць легітымнымі гэтыя выбары. Варыянт з прызнаньнем пасьля масавага зьняцьця апазыцыяй сваіх кандыдатаў, пры 50% безальтэрнатыўных акруг, выглядаў бы досыць цынічна.

Візыт міністра замежных справаў Польшчы Радаслава Сікорскага, а таксама заявы шматлікіх літоўскіх палітыкаў сьведчаць таксама пра жаданьне суседніх краін палепшыць стасункі зь Беларусьсю. Выбары — ідэальная для гэтага нагода. А мэта — вырваць хай нават аўтарытарную Беларусь з-пад уплыву Масквы.

Лукашэнка таксама ва ўсіх інтэрвію падкрэсьлівае, што зацікаўлены ў прызнаньні выбараў.

**ЗП**

# Аптымізм Эўропы не заменіць нам Беларусі

Выгадныя кантракты для эўрапейскіх кампаній не прывядуць да аднаўленьня палітычных і культурных свабодаў у нашай краіне. Таму ўнутры краіны ўсе размовы пра «лібэралізацыю» выклікаюць скепсіс або сьмех. Піша **Андрэй Павач**.

Польскія публіцысты марнуюць масу паперы, прапануючы чытачам свае вэрсіі рэзкага «пацяпленьня» ў адносінах ураду Польшчы да афіцыйнага Менску. Польшча, якая ў Брусэлі заўсёды была самым зацятым прыхільнікам санкцый супраць беларускага ўраду, цяпер у асобе міністра замежных справаў Р.Сікорскага хадайнічае аб зьняцьці часткі санкцый пры ўмове «правядзеньня дэмакратычных выбараў».

Асабліва ўражваюць апошнія весткі аб тым, што ў імя паляпшэньня адносін Варшавы і Менску польскае МЗС гатовае нават ахвяраваць галоўным змагаром за правы палякаў у Беларусі — лідэрам непрызнанага «Саюзу палякаў Беларусі» Анжалікай Борыс. Беспрэцэдэнтная і, трэба адзначыць, рызыкоўная акцыя польскіх дыпляматаў найчасьцей знаходзіць у польскіх журналістаў адно тлумачэньне: «Калі беларусы самі ня ў стане правесьці дэмакратычныя зьмены ў сваёй краіне — іх трэба дамагчыся саступкамі і палітычна-эканамічным лявіраваньнем».

Тым ня менш, «беларускае пытаньне» на фоне грузінска-расейскага канфлікту і ўнутраных праблем ня займе ў польскіх газэтах першых старонак. Польскае грамадзтва ў пэўнай меры ўспрымае дзеяньні свайго МЗС як працяг антырасейскай палітыкі па пошуку саюзьнікаў, якую запачаткавалі жнівеньскія падзеі на Каўказе. Аднак, гледзячы па ўсім, гэта не зусім праўда. У перамовах зь беларускім урадам удзельнічае выключна польскае Міністэрства замежных справаў на чале з Радаславам Сікорскім, найбліжэйшым паплечнікам прэм’ера Д.Туска, а менавіта МЗС у свой час жорстка крытыкавала візыт прэзыдэнта Качыньскага ў Тбілісі. У сваю чаргу Л.Качыньскі, камэнтуючы перамовы беларускага і польскага міністраў замежных справаў у Белавескай пушчы, адзначыў, што іх ініцыятыва зь яго боку не сыходзіла. Выглядае на тое, што палітычная гульня ўраду Д.Туска ў дачыненьні да Беларусі матывуецца галоўным чынам жаданьнем атрымаць канкрэтныя эканамічныя выгады ад гандлю з усходнім суседам і ўзьняць свой палітычны аўтарытэт у Брусэлі.

Працяг на старонцы 5.



Анжаліка Борыс дорага заплаціла за сваю барацьбу за права на свабоду асацыяцыі. На фота: яна пасьля аднаго з шматлікіх судоў, сярод паплечнікаў.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Польскае пытаньне вырашыць пакуль не ўдалося

У прамежак часу між візытам у Беларусь міністра замежных справаў Польшчы Радаслава Сікорскага і парлямэнцкімі выбарамі актуальнай зноў зрабілася тэма непрызнанага ўладамі Саюзу палякаў на чале з Анжалікай Борыс.

На гэты раз пытаньне ўзьняла ўплывовая Rzeczpospolita, якая на мінулым тыдні выйшла з загалоўкам на першай паласе: «МЗС Польшчы гатовае «прадаць» Анжаліку Борыс». Газэта паведаміла пра сустрэчу спн.Борыс у замежнапалітычным ведамстве Польшчы, якая адбывалася за некалькі дзён да візыту Сікорскага. Падчас размовы старшыні СПБ прапанавалі адмовіцца ад пасады на карысьць геапалітычных інтарэсаў Польшчы.

Нагадаем, што канфлікт у Саюзе палякаў пачаўся яшчэ ўвесну 2005 году, калі зьезд арганізацыі замест вернага ўладам старшыні Тадэвуша Кручкоўскага абраў настаўніцу Анжаліку Борыс. Мін’юст не прызнала вынікі таго зьезду. Неслабы лямант узьняўся ў дзяржаўных СМІ. У выніку замест аднаго саюзу атрымалі два. Непрызнаны — пад кіраўніцтвам усё той жа Борыс, і афіцыйны, які ў жніўні 2005 году ўзначаліў пэнсіянэр Юзаф Лучнік.

Ці ня ўсе лідэры непрызнанага СПБ праходзілі пад крымінальнымі справамі — Анжаліка Борыс, Анджэй Пачобут, Юзаф Пажэцкі, Веслаў Кеўляк, Анджэй Пісальнік, Тадэвуш Гавін. Зрэшты, да суду так ніводная справа і не дайшла.

Паводле Rzeczpospolita, быў нават распрацаваны плян аб’яднаньня зьезду саюзаў, які меўся прайсьці ў лістападзе ў Берасьці. Газэта адзначае, што кампраміснай фігурай на месца старшыні магла б стаць Аліна Ярашэвіч.

«Было б вельмі прыкра, калі б гэта аказалася праўдай — сказаў першы старшыня СПБ Тадэвуш Гавін у інтэрвію «Польскаму радыё для Беларусі», — Анжаліка Борыс моцна пацярпела за сваю польскасьць».

У 2005 годзе падчас скандалу з саюзамі палякаў кіраўніца берасьцейскай філіі арганізацыі Ярашэвіч таксама была досыць заўважнай фігурай. У незалежных СМІ была інфармацыя, што супраць жанчыны заведзеная крымінальная справа па артыкуле «Махлярства», нібыта яна атрымлівала грошы ад бацькоў, чые дзеці накіроўваліся на адпачынак у Польшчу. Анжаліка Борыс нават была вымушаная зьвяртацца ў Генэральную пракуратуру, яна сьцьвярджала, што на працягу двух месяцаў Ярашэвіч спрабавала завэрбаваць КДБ.

У кампраміс, замест страты пасады ў саюзе палякаў, Анжаліцы Борыс прапанавалі балятавацца ў парлямэнт, але жанчына адказала катэгарычнай адмовай.

20 верасьня ў Горадні прайшло пасяджэньне Галоўнай Рады непрызнанага саюзу. Сустрэчу наведаў асабіста пасол Польшчы Хенрых Літвін. Але нават ягоная прысутнасьць не адбілася на пазыцыі СПБ. Яны адмовіліся прымаць прапановы польскага МЗС пра фармаваньне працоўнай групы для перамоваў з саюзам Юзафа Лучніка. Як піша ў сваім блогу Анджэй Пачобут, «разам з тым была агучана гатоўнасьць да перамоваў з уладамі, «але ня зь іхнымі марыянэткамі».

На думку Пачобута, «пасол Беларусі ў Польшчы Павал Латушка вяртаецца на радзіму. Місія скончылася. На заканчэньне пасол хацеў зрабіць «дэмбельскі акорд» — адным махам вырашыць праблему расколатага СПБ. Спрыяльныя ўмовы (пацяпленьне адносінаў з Захадам) і прыхільнасьць палітыкаў урадавай Польскай сялянскай партыі зрабілі сваю справу. Удалося пралабіраваць у польскім МЗС сваю прапанову ўрэгуляваньня. Але хапіла толькі ўзгадваньня ў СМІ, і ўсе ўдзельнікі нібыта гатовай угоды пачалі гучна тлумачыцца і казаць, што іх ня так зразумелі».

23 верасьня адбылася сустрэча Анжалікі Борыс з прэм’ер-міністрам Польшчы Дональдам Тускам. Кіраўнік ураду падкрэсьліў, што размова з Борыс паказала, наколькі важная сёньня актыўнасьць палякаў у Беларусі і асабістая роля яе старшыні. Сама ж Борыс заўважыла, што дзейнасьць СПБ залежыць ад адносінаў Варшавы зь Менскам.

Паводле прэм’ера, умовай пацяпленьня ў дачыненьнях зь Беларусьсю ёсьць сумленнае прызнаньне «аўтэнтычнага руху польскай меншасьці» ў Беларусі. — І лідэрам гэтага руху ёсьць Анжаліка Борыс, — дадаў Туск.

**Зьміцер Панкавец**

# Фінькевіч ледзь не загінуў у аўтакатастрофе

**Былы палітвязень Артур Фінькевіч у суботу 20 верасьня трапіў у аўтакатастрофу. Хлопец вяртаўся з Горадні, дзе праходзіла сустрэча зь мясцовымі актывістамі. На павароце на Шчучын «Опэль Амэга» Фінькевіча вылецеў з шашы на 25 мэтраў і тройчы перакуліўся. Артур сьцьвярджае, што напярэдадні ганяў машыну ў рамонт і што аўтамабіль быў у поўным парадку. На шчасьце, Артур і два ягоныя пасажыры не пацярпелі.**



## СЬЦІСЛА

### Казулін пабываў на прыёме ў Буша

Былы палітвязень А.Казулін у Нью-Ёрку сустрэўся з прэзыдэнтам ЗША Джорджам Бушам і дзяржсакратаром ЗША Кандалізай Райз. Вось што сказаў былы палітвязень для радыё «Свабода» перад адлётам з ЗША ў Эўропу: «Сёньня адбылася сустрэча з прэзыдэнтам ЗША Джорджам Бушам і Дзяржсакратаром ЗША Кандалізай Райз, а таксама жонкай прэзыдэнта Лорай Буш. Гэта была вельмі цікавая сустрэча, у якой бралі ўдзел вядомыя змагары за свабоду, за правы чалавека, яскравыя дысыдэнты з розных краінаў — Бірмы, Вэнэсуэлы, Сірыі, Эгіпту, Кубы... Прысутнічалі спадары Вітаўтас Ляндсбэргіс і Гары Каспараў. На гэтай сустрэчы было адзначана, што фундамэнтальныя чалавечыя каштоўнасьці, правы чалавека, свабода — гэта галоўнае ў той пазыцыі, якую займаюць ЗША. Было вельмі дакладна адзначана і самім Джорджам Бушам, і прысутнымі, што нельга паступацца прынцыпамі».

### У Беларусь прыйшла астранамічная восень

22 верасьня, у 18 гадзін 44 хвіліны сонца перакрочыла нябесны экватар з паўночнага паўшар’я ў паўднёвае. Такое здараецца два разы ў год: у дні вясновага і восеньскага раўнадзенства. Дзень сёньня зраўняўся з ноччу і працягвае пацяху зьмяншацца.

### Сьцяплее

Паводле прагнозу Рэспубліканскага гідрамэтэацэнтру, 25—27 верасьня будзе суха. Ночы ясныя, таму халодныя, а вось удзень паветра будзе праграваецца да 16—18 градусаў.

### Выстава Радзівілкі і Селіханава

адкрылася 23 верасьня ў менскай мастацкай галерэі «ЛаСандр-арт». Мастакі —сямейная пара, з самых адметных творцаў. Выстава працуе да 11 кастрычніка.

### Спэкулянтаў білетамі на матч БАТЭ — Ювэнтус затрымліваць ня будуць

Пра гэта «Народнай газеце» паведамілі ў сталічнай падатковай інспэкцыі. «Калі б людзі займаліся такім бізнэсам сыстэматычна, гэта была б незаконная прадпрымальніцкая дзейнасьць, але матчы, якія карыстаюцца попытам у беларускіх заўзятараў, праходзяць у Менску вельмі рэдка. Падставы затрымліваць чалавека, які перапрадае білеты, скажам, раз на год, у нас няма. Раптам ён купіў квіткі для сваіх сяброў, а яны не прыйшлі на матч? Дый перапродаж білетаў не зьяўляецца зарэгістраваным відам дзейнасьці. Лепш хай міліцыя падумае, адкуль перакупшчыкі бяруць столькі білетаў…»

На першы ў Беларусі матч Лігі чэмпіёнаў некаторыя набывалі па 150—200 білетаў «нібыта для сябе, сваякоў і сяброў».

Матч БАТЭ — Ювэнтус пройдзе ў Менску 30 верасьня.

**МБ, АГ**

# Экспэрымэнтальныя акругі ўлады

За некалькі дзён да абвяшчэньня вынікаў парлямэнцкіх выбараў не складае асаблівай цяжкасьці вызначыць кандыдатаў ад улады і меркаваных пераможцаў па большасьці акругаў. Аднак ёсьць і рэгіёны, дзе выпрабоўваюцца «новыя тэхналёгіі».

### І хто тут ад улады?

У сьпісах кандыдатаў значыцца 34 прозьвішчы сёньняшніх дэпутатаў палаты. Сярод іх Алег Вялічка, Уладзімер Здановіч, Уладзімер Адашкевіч, Міхаіл Русы, Міхаіл Арда, Тацяна Голубева, Віктар Гумінскі, Галіна Юргілевіч. Гэта нашмат менш, чым пераабіралася мінулы раз, аднак далёка ня ўсе яны сёньня могуць быць упэўненымі, што патрапяць у парлямэнт новага скліканьня.

Вось паспрабуй вызначыць, хто ідзе па лукашэнкаўскім сьпісе ў Віцебскай-Чкалаўскай акрузе — дэпутат Аляксандар Гудкоў ці галоўны доктар Віцебскай клінічнай бальніцы Віктар Аўчыньнікаў?

Абсалютна аналягічная сытуацыя назіралася ў Вялейска-Мядзельскай акрузе, дзе за мандат мусілі змагацца дэпутат Віктар Анікеенка і галоўны доктар мясцовай раёнкі Ігар Сьпільнічэнка. Аднак у апошні момант Анікеенка зьняўся.

Тое ж у Горках: з дэпутаткай Тацянай Асмалоўскай канкуруе галоўны лекар Мсьціслаўскай райбальніцы Алена Караед, і ў гэтай акрузе яшчэ ёсьць вылучэнец АДС Андрэй Юркоў.

Цікавая сытуацыя назіраецца па Каліноўскай акрузе сталіцы, дзе вылучаецца Вольга Абрамава, супернікам жа ў яе галоўны вучоны сакратар Акадэміі навук Мікалай Казак.

У Іўі выбар будзе між дэпутатам Уладзімерам Баршчовым і намесьнікай старшыні Ашмянскага райвыканкаму Валянцінай Лузынай (кандыдата ад апазыцыі, былога палітвязьня Івана Крука не зарэгістравалі).

У Быхаве дэпутат Алег Сакадынец будзе змагацца з дырэктарам раённага цэнтру сацыяльнага абслугоўваньня Валянцінай Гарыловіч.

Ня выключана, што гэтыя дэпутаты, хоць і не патрапілі ў меркаваны сьпіс наступных абраньнікаў, але не пагадзіліся з сваёй доляй. Ёсьць і іншая вэрсія. Праверыць, за каго людзі лепш галасуюць: за дзейсных дэпутатаў ці прадстаўнікоў мясцовых уладаў. Варта адзначыць, што па такіх акругах амаль нідзе не рэгістравалі вылучэнцаў АДС. Напэўна, для чысьціні экспэрымэнту.

### Віцебская група

Істотныя зьмены па выбарах чакаюцца ў віцебскім кіраўніцтве. Мяркуйце самі: у дэпутаты палаты балятуюцца старшыня аблвыканкаму Ўладзімер Андрэйчанка (Глыбокае), ягоны намесьнік Пётар Южык (Полацак), старшыня камітэту прыродных рэсурсаў аблвыканкаму Васіль Байкоў (Віцебская вясковая), старшыня Віцебскага гарсавету Генадзь Грыцкевіч (Віцебская-Горкаўская акруга). Апроч гэтага на Віцебшчыне балятуюцца некалькі старшыняў райвыканкамаў — Чашніцкага, Пастаўскага.

Што да Андрэйчанкі, то гэта старажыл уладнай вэртыкалі. На сваёй пасадзе ён працуе ад лістападу 1994 году. Ніхто зь ягоных калегаў так доўга ў «губэрнатарскім» фатэлі не затрымліваўся. Цяпер жа Андрэйчанку хочуць перавесьці на ганаровае месца дэпутата палаты.

Дарэчы, паводле чутак, менавіта Андрэйчанка будзе віцэ-сьпікерам парлямэнту новага скліканьня. Ну а старшынём палаты можа стаць яшчэ адзін дэпутат ад Віцебскай вобласьці — Аляксандар Папкоў. Намесьнік кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта балятуецца ў Сяньне-Лёзьне.

Да слова, Папкоў не адзіны прадстаўнік Адміністрацыі, які хоча стаць дэпутатам. Па Маладэчанскай вясковай акрузе на безальтэрнатыўнай аснове ідзе начальнік галоўнага ўпраўленьня кадравай палітыкі Адміністрацыі пэнсіянэр Уладзімер Сіняков.

Не адных іх выпраўляюць у парлямэнт на ганаровую пэнсію. Па крычаўскай акрузе балятуецца начальнік аддзелу па ідэалягічнай працы Ўпраўленьня справамі прэзыдэнта Тамара Белкіна.

Чакаюцца зьмены ў кіраўніцтве і іншых абласьцей, апроч Меншчыны і Берасьцейшчыны. Напрыклад, на Гомельшчыне ў барацьбу за дэпутацкі мандат уступілі старшыня гарвыканкаму Аляксандар Бяляеў (Гомельская-Сельмашаўская), старшыня райвыканкаму Ўладзімер Маёраў (Гомельская вясковая) і галоўны дарадца старшыні аблвыканкаму Георгі Дашкевіч (Хойнікі).

У палату пасялілі і адыёзнага для інтэлігенцыі старшыню Гарадзенскага гарвыканкаму Аляксандра Антоненку (Гарадзенская-Занёманская). Вылажыў каралеўскі горад плітачкай — у сталіцу яго. Таксама ідуць на выбары два намесьнікі Ўладзімера Саўчанкі па Гарадзенскім аблвыканкаме — Васіль Сьцяпура (Масты) і Марыя Бірукова (Шчучын). Прычым абедзьве акругі засталіся ім безальтэрнатыўнымі пасьля нерэгістрацыі апазыцыйных кандыдатаў.

Намесьнік старшыні Магілёўскага аблвыканкаму Анатоль Глаз балятуецца ў Бабруйскай вясковай акрузе, а старшыня Магілёўскага райвыканкаму — Аляксандар Розганаў па Магілёўскай вясковай.



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Аляксандар Папкоў, намесьнік кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта, напэўна, стане старшынём палаты.**

### Асабліва заслужаныя

Усё ідзе да таго, што новага кіраўніка па выбарах атрымае і Беларуская чыгунка. Сёньняшні яе начальнік Уладзімер Жарэла будзе спрабаваць прабіцца ў палату ў Воршы (вядомы чыгуначны вузел краіны).

Зьвяртае на сябе ўвагу вылучэньне ў Менску па Партызанскай акрузе дырэктаркі ПТВ №55 будаўнікоў Тамары Шчарбацэвіч. Менавіта гэтая жанчына ў 2003 г. была прызначаная дырэктаркай Гуманітарнага ліцэю імя Якуба Коласа, калі яго хацелі зруйнаваць. Неўзабаве Ліцэй спыніў сваё легальнае існаваньне. Пра Шчарбацэвіч жа не забыліся. Відаць, каштоўны кадар.

Значную частку праўладных вылучэнцаў складаюць галоўныя дактары бальніц і шпіталёў, дырэктары школ і каледжаў, прадстаўнікі ЖКГ і БРСМ, старшыні судоў і ваенныя камісары, рэдактары «раёнак» і супрацоўнікі буйных прадпрыемстваў (апошнія найчасьцей у Менску).

**Зьміцер Панкавец**

## Шанцы апазыцыі

Статкевіч: «Выпадковых людзей там ня будзе».

Лідэр ПКБ Сяргей Калякін перакананы, што ў палату прадстаўнікоў можа трапіць да пяці апазыцыйных дэпутатаў. Усё часьцей у кулюарах называецца прозьвішча эканаміста Яраслава Раманчука — нібыта на яго пакажа ўладарны палец.

Пасьля хвалебных словаў Лукашэнку і ўладам на круглым стале ў часопісе «Беларуская думка», сталі гаварыць пра дэпутацкія амбіцыі грамадоўца Ўладзімера Нісьцюка.

Лідэр «Эўрапейскай кааліцыі» Мікола Статкевіч выступіў з досыць рэзкай крытыкай магчымых апазыцыйных дэпутатаў. «Выпадковых людзей там ня будзе. З усімі апазыцыянэрамі, што туды трапяць, перамоўлена ўжо сем разоў. Гэта будуць людзі, на якіх ёсьць кампрамат, кшталту таго, што паказваюць на БТ пра дыпляматаў, ці з гэтымі людзьмі ўжо падпісаны кантракт у адпаведнай установе. Лукашэнка ні з кім не зьбіраецца дзяліцца ўладай, гэта відавочна. Хутчэй за ўсё, што падмануць і тых апазыцыянэраў, якім паабяцалі месцы ў парлямэнце», — кажа М.Статкевіч.

22 верасьня Лукашэнка правёў «нараду аб ходзе выбарчай кампаніі ў краіне». Ці ня там вырашалася будучыня магчымых апазыцыйных кандыдатаў? Дарэчы, на нарадзе была агучаная лічба 85% ад агульнай колькасьці выбарцаў, што могуць узяць удзел у галасаваньні. Такую самую лічбу называла на выходных і БТ. Пасьля гэтага сумневы пра афіцыйную колькасьць удзельнікаў галасаваньня амаль няма.

**ЗП**

**Размова Лукашэнкі з Саланам**

24 верасьня адбылася тэлефонная размова Аляксандра Лукашэнкі зь вярхоўным прадстаўніком Эўрасаюзу па пытаньнях замежнай палітыкі Хаўерам Саланам. Былі абмеркаваньня пытаньні ўнутрыпалітычнай сытуацыі Беларусі, а таксама спэктар супрацоўніцтва з Эўрасаюзам. Была падкрэсьлена важнасьць адкрыцьця новай старонкі ў стасунках Беларусі і ЭС, падкрэсьлілі ў прэс–службе кіраўніка Беларусі.

**БелаПАН**

## «Умешвацца ніякім назіральнікам ня будзе дазволена!»

На «нарадзе аб ходзе выбарчай кампаніі ў краіне» Аляксандар Лукашэнка ва ўласьцівай яму манеры, няпростым тэкстам, заявіў, што

«[калі нехта] ставіць пытаньне, што ... вось мы, назіральнікі і іншыя, прыйдзем, закасаем рукавы і будзем за кагосьці там лічыць галасы, то скажу: у нас гэта ўсё рэгляmэнтавана законам! Мы ні ад каго вынікаў не хаваем. Але гаспадары — старшыні ўчастковых камісій».

Гэткія словы інтэрпрэтаваць можна так: ніхто ня мае права патрабаваць кантролю за падлікам галасоў. Там, дзе падтрымка дзяржаўнае палітыкі гарантаваная, а дэструктыўных элемэнтаў не назіраецца, можна дазваляць сачэньне за падлікам. Але там, дзе, так бы мовіць, магчымыя правакацыі, вы маеце права адмовіць. У любым разе, уся адказнасьць кладзецца на вас, і пры патрэбе абапірайцеся на рэсурс выканкамаў і органаў: «умешвацца ніякім назіральнікам у сытуацыю ня будзе дазволена!» «Там Лідзія Міхайлаўна давяла ўсім: як сябе весьці, што рабіць згодна з законам. ... патрэбная нейкая практычная дапамога, падтрымка — калі ласка, старшыні райвыканкаму ... прымуць рашэньні пра яе аказаньне».

**МБ**

# Выбары, выбары...

Парлямэнцкія выбары—2008 будуць самымі безальтэрнатыўнымі ў найноўшай гісторыі краіны.

У абсалютнай большасьці акругаў за Менскам будзе ці адзін, ці два кандыдаты. З выбарчай гонкі сышлі пяцёра менскіх прадстаўнікоў АГП, але, пад ціскам заходніх дыпляматаў, засталіся Партыя БНФ і БХД.

### Байкоту ня будзе

Пра тое, што ніякага байкоту ня будзе, лідэры АДС заявілі яшчэ 12 верасьня. Фактычна, зрабіўшы наступнае пасяджэньне Палітрады справай пустой. Было прынятае «кампраміснае» рашэньне, паводле якога ўжо цяпер можна гаварыць, што кааліцыя не прызнае выбары ні свабоднымі, ні справядлівымі. Гэта пацьвердзяць сваімі подпісамі ўсе вылучэнцы са «сьпісу 110-ці».

Разам з тым, на заключным этапе выбарчай кампаніі апазыцыя зьбіраецца сканцэнтравацца на назіраньні за падлікам галасоў. Рабіцца гэта будзе на тых акругах, дзе балятуюцца канкурэнтаздольныя кандыдаты, з мэтай дэманстрацыі канкрэтных доказаў фальсыфікацыі выбараў.

Варта адзначыць, што перафармуляваць сваё папярэдняе рашэньне быў вымушаны і Сойм БНФ. Раней партыя прыняла пастанову аб зьняцьці сваіх кандыдатаў у дэпутаты да 23 верасьня. Пасьля гэтага зьявіўся ліст пятнаццаці незадаволеных вылучэнцаў БНФ (пераважна рэгіяналаў), якія выступалі за ўдзел у выбарах да канца.

Новым рашэньнем Сойм «дазволіў» кандыдатам зьнімацца, а не абавязаў. Такім правам скарысталіся толькі двое — Станіслаў Суднік у Лідзе і намесьнік старшыні партыі Аляксей Янукевіч у менскай Чыжоўцы. Астатнія засталіся.

Ад БХД, якая таксама заяўляла пра імаверны байкот выбараў, зьняліся таксама толькі два кандыдаты — Тацяна Севярынец (Віцебская-Горкаўская акруга) і Кастусь Жукоўскі (Буда-Кашалёўская).

Нечакана ж самае масавае зьняцьцё кандыдатаў адбылося ў АГП. З выбарчай гонкі добраахвотна сышлі адразу пяцёра вылучэнцаў партыі па Менску. Сваё рашэньне кандыдаты растлумачылі тым, што яны так і не змаглі надрукаваць агульную перадвыбарчую ўлётку. Прадстаўнікі АГП зьвярталіся ў паўдзесятка тыпаграфій, але паўсюль сутыкаліся з адмоваю.

Зьняліся ключавыя фігуры АГП — Аляксандар Дабравольскі (Сьвіслацкая выбарчая акруга №94), Валянціна Палевікова (Купалаўская выбарчая акруга №95), Станіслаў Багданкевіч (Чкалаўская выбарчая акруга №96), а таксама маладзейшыя Ганна Ягорава (Паўднёва-Заходняя акруга №99) і Кацярына Маласаева (Коласаўская выбарчая акруга №106).

У выглядзе выключэньне было вырашана пакінуць старшыню АГП Анатоля Лябедзьку як сустаршыню АДС. Дарэчы, праца менскага крыла партый у значнай ступені і будзе скіраваная на назіраньне за выбарамі ў Старавіленскай акрузе, дзе і балятуецца Лябедзька.

На сёньня ў выбарах працягваюць удзельнічаць 66 вылучэнцаў ад АДС, а таксама 22 ад «Эўрапейскай кааліцыі».

**ЗП**


PHOTO.BYMEDIA.NET

**28 верасьня вызначыцца палітычная пэрспэктыва Сяргея Калякіна, які паставіў на ўдзел.**

## Канкурэнтная Магілёўшчына і безальтэрнатыўная Гарадзеншчына

Калі ня браць у разьлік Менск, то самым канкурэнтным рэгіёнам краіны падчас парлямэнцкіх выбараў чакана стане Магілёўская вобласьць.

Кандыдаты ў гэтым рэгіёне, у тым ліку апазыцыйныя, амаль не сутыкаліся з адмовамі.

На Магілёўшчыне няма ніводнай безальтэрнатыўнай акругі. Агулам жа з трынаццаці акругаў толькі ў пяці будзе па два кандыдаты, па іншых — ад трох да шасьці. Сярэдні ж конкурс складзе 3 чалавекі на месца, гэта болей, чым па краіне (2,4).

Для параўнаньня: на Гарадзеншчыне, якая таксама мае 13 акругаў, конкурс складае 1,7 чалавекі на месца. Шэсьць акругаў увогуле засталіся безальтэрнатыўнымі. Нешта падобнае назіраецца і ў заходніх раёнах Меншчыны, дзе ўчастковыя камісіі адмовіліся рэгістраваць прадстаўнікоў апазыцыі.

Гэта можна растлумачыць вялікай базай лукашэнкаўскага электарату на Магілёўшчыне. Там, зь меркаваньня ідэолягаў, народ усё адно не прагаласуе за апазыцыю. Зусім жа іншае стаўленьне да рэгіёнаў кшталту Мядзела, Навагрудку, Смургоняў, Ваўкавыску, Іўя, Мастоў, Шчучыну, Нясьвіжу ці Барысава. Таму гэтыя акругі, ад граху далей, і зрабілі безальтэрнатыўнымі.

**Зьміцер Панкавец**

## Пазьняк: засталося толькі абняцца з Лукашэнкам

Лідэр КХП-БНФ чарговы раз заклікаў байкатаваць выбары.

«Расейцам і Лукашэнку патрэбная легітымная «палата». Першым — каб замацаваць працэс і вынікі акупацыі Беларусі; другому — каб зьняць з сябе адказнасьць. Таму йдзе дэмагогія пра «дэмакратычныя» выбары і адначасна жорстка душацца нават мінімальныя магчымасьці вольных выбараў. Эўропа, старая філісьцерская Эўропа, якая баіцца пераплаціць, якую адкрыта дураць і хочуць ашукаць, прыкідваецца, што ўсяму гэтаму ашуканству верыць і робіць выгляд, што ёй прыемна. Яна гатовая ўжо заранёў прызнаць фальсыфікат і недэмакратычныя выбары за дэмакратычныя», — даводзіць Пазьняк.

Такім чынам, кажа Зянон Пазьняк, «усе» хочуць расплаціцца за меркаваны «геапалітычны выбар» Лукашэнкі (які скончыцца адразу, пасьля выбараў) прызнаньнем фальшывых выбараў за сапраўдныя».

Палітык заклікае: «Ніхто на фальшывыя выбары!»

**МБ**

# «Лісты зь лесу» таксама «экстрэмізм»

18 верасьня Кастрычніцкі суд Горадні мусіў пачаць разгляд справы па прызнаньні экстрэмісцкай друкаванай прадукцыі, што ў розныя гады была канфіскаваная гарадзенскімі памежнікамі. Аднак суд быў перанесены і пройдзе ў кастрычніку пасьля парлямэнцкіх выбараў.

Па справе праходзіць ажно дзевяць чалавек — журналіст Анджэй Пісальнік, сябар АГП Ўладзімер Ларын, сёньняшнія і былыя студэнты праграмы Каліноўскага Яўген Скрабутан, Аляксей Трубкін, Дзьмітры Мальчык, Барыс Гарэцкі, праваабаронца Валеры Шчукін, Юры Марціновіч і Дзьмітры Ёдка (апошнія — выпадковыя сьпіртавозы, якія недзе перад выбарамі падабралі ўлёткі Мілінкевіча і мелі іх з сабой).

Справу распачаў абласны КДБ. На іхнюю думку, канфіскаваная матэрыялы могуць мець «экстрэмісцкі характар». У чым менавіта ён можа заключаецца не адзначаецца. Цяпер жа КДБ просіць, каб суд дапамог разабрацца, што да чаго.

«Напярэдадні мясцовых выбараў, у сьнежні 2006 году, на мяжы ў мяне канфіскавалі дзьве флэшкі з рознымі фоткамі, відэазапісамі, там жа былі нейкія паперы «Маладога фронту». Я пісаў кучу ўсялякіх скаргаў, каб вярнулі назад. Кажуць, правяраем. Яшчэ да гэтага, пасьля першага Кангрэсу дэмсіл, дзе абіралі Мілінкевіча, ехаў у Польшчу з дакумэнтамі Кангрэсу. Таксама на праверку забралі. Напісалі, што яны стымулююць пратэстныя настроі і распальваюць сацыяльную варожасьць, а таксама прыносяць шкоду палітычным інтарэсам дзяржавы. Аднойчы яшчэ кнігу Севярынца «Лісты зь лесу» канфіскавалі, якую чытаў у машыне на мяжы. Пра Севярынца сказалі, што яго кніга накіраваная на захоп дзяржаўнай улады неканстытуцыйным шляхам», — кажа Яўген Скрабутан.

Журналіст Анджэй Пісальнік быў адным зь нямногіх фігурантаў справы, які зьявіўся па позьве ў суд. Пісальнік, які апошнім часам жыў у Маскве, цяпер знаходзіцца ў Горадні, дзе спрабуе рэабілітавацца пасьля інсульту.

У 2006 годзе гарадзенскія мытнікі сканфіскавалі ў сп.Пісальніка наклад газэты «Głos znad Niemna na uchodźstwie». Праз два з палова гады праверкі высьветлілася, што і гэтае выданьне можа мець «экстрэмісцкія заклікі».

«Я скарыстаў пасяджэньне, каб больш падрабязна азнаёміцца з матэрыяламі справы. Думаў, што там можа быць нешта такое, чаго я яшчэ ня бачыў — праверка лінгвістаў ці хаця б пераклад матэрыялаў газэты на расейскую ці беларускую мовы. Нічога такога я не пабачыў. Ёсьць толькі запыт намесьніка старшыні абласнога Гарадзенскага КДБ Маневіча, што ён азнаёміўся з выданьнем і яно можа мець «экстрэмісцкі зьмест». Я ня ведаю, ці ўмее вышэйзгаданы спадар увогуле чытаць па-польску, калі шчыра», — кажа А.Пісальнік.

Актывіст непрызнанага ўладамі Саюзу палякаў ня можа прагназаваць, чым скончыцца гэтая справа. «Калі не разумееш у чым лёгіка, то рабіць нейкія прагнозы бессэнсоўна. Ня выключана, што гэтую справу могуць перакваліфікаваць у крымінальную, дзе прадугледжваецца зьняволеньне да пяць гадоў. Не выключаю, што «Głos znad Niemna na uchodźstwie» таксама могуць прызнаць экстрэмісцкім выданьнем і забараніць распаўсюд на тэрыторыі краіны. Цяжка нават уявіць, як будзе адбывацца разгляд справы, бо той жа «Głos…» і «Звычайны прэзыдэнт» Калінкінай і Шарамета — гэта вельмі розныя рэчы», — кажа А.Пісальнік.

«Прэцэдэнт даволі трывожны, — кажа віцэ-прэзыдэнт Міжнароднай фэдэрацыі правоў чалавека Алесь Бяляцкі. — Калі гэтыя папраўкі аб экстрэмізьме прымаліся палатай прадстаўнікоў, то мы прагназавалі, што яны могуць быць выкарыстаныя супраць іншадумцаў. Як бачым, зьявіліся першыя ластаўкі».

Чаму суд перанесены? «Думаю, што судзьдзя сам не разабраўся, што ад яго хочуць. Асабіста я буду хадайнічаць аб спыненьні справы», — кажа А.Пісальнік. Ёсьць і больш праўдападобнае тлумачэньне. Фігурантам павядамілі, што позвы на наступнае пасяджэньне суду будуць выпісаныя ў пачатку кастрычніка. Акурат пасьля парлямэнцкіх выбараў. Такі сыгнал Захаду: не прызнаеце выбараў, зноў пачнём мачыць «вашых».

**Зьміцер Панкавец**

# Аптымізм Эўропы не заменіць нам Беларусі

**Працяг са старонкі 2.**

Беларускі ўрад з задавальненьнем прымае прапанаваныя яму ўмовы гульні. Выпушчаныя з турмы некалькі вязьняў, Цэнтравыбаркам прымае шэраг «беспрэцэдэнтных рашэньняў», а Ярмошына разам зь Пяткевіч і ўсімі іншымі ўжо бачаць сябе на міжземнаморскіх пляжах.

Цяпер спынімся на тым, што можа даць беларускаму грамадзтву гэтае так званае «пацяпленьне», нават калі б яно рэальна пачалося. Шэраг сумнеўных эканамічных карысьцяў, якія калі каму і будуць на карысьць, то толькі рэжыму? Ці, можа, дэмакратычныя выбары, хоць сапраўды дэмакратычныя выбары магчымыя ў краіне толькі пасьля сама меней году нармальнага функцыянаваньня ўсіх палітычных і грамадзкіх арганізацый, сродкаў масавай інфармацыі? Ці паляпшэньня візавага рэжыму, хоць такое рашэньне можа быць прынятае адно ў Брусэлі, а ніяк ня ўрадам Д. Туска? Думаю, усё гэта мала зьменіць сытуацыю ў краіне, насельніцтва якой мела толькі адны дэмакратычныя выбары, дый тое пятнаццаць гадоў таму. Ва ўсякім разе замежнапалітычнае лявіраваньне беларускай улады — гэта ня больш чым імкненьне стварыць прыгожую карцінку для тэлебачаньня ўнутры і па-за межамі Беларусі толькі з адной мэтай — захаваць унутры краіны існы стан рэчаў. Што ж датычыць замежнапалітычных прыярытэтаў, то, перакананы, прыцягальная сіла расейскіх газавых труб акажацца мацнейшай за ўсе абяцанкі. Замежнапалітычны курс ня зьменіцца, і яскравым доказам гэтага будзе, здаецца, даволі хуткае прызнаньне Беларусьсю незалежнасьці Абхазіі і Паўднёвай Асэтыі. Усё, што сёньня робіць сваімі акцыямі Эўропа ў асобе Р.Сікорскага, толькі стварае для Лукашэнкі больш спрыяльную каньюнктуру ў гандлі з Расеяй за энэрганосьбіты.

Напрыканцы яшчэ адна выключная водле сваёй важнасьці рэч, якая, на думку аўтара, пераважае ўсе астатнія плюсы і мінусы міфічнага «пацяпленьня» і на якую зусім не зьвяртаюць увагі заходнія публіцысты і аналітыкі. Беларусі разам з агульнапрызнанымі дэмакратычнымі свабодамі патрэбна буйнамаштабнае адраджэньне нацыянальнага жыцьця, пад якім я разумею прызнаньне нацыянальных сымбаляў у якасьці дзяржаўных, шырокую кампанію па пашырэньні ўжываньня беларускай мовы і прапагандзе нацыянальных каштоўнасьцяў, сур'ёзную і рэальную (у адрозьненьне ад папяровых) рэформу сярэдняй і вышэйшай адукацыі. Толькі гэта дасьць нам магчымасьць умацаваць свой нацыянальны гонар, пачуцьцё адказнасьці ня толькі за сябе і сваіх блізкіх, але і за ўвесь народ. Бяз гэтага немагчымае дасягненьне ўсіх далейшых мэтаў: дэбюракратызацыі, разьвіцьця мясцовага самакіраваньня, пашырэньня прыватнай ініцыятывы…

Многія аўтарытэтныя навукоўцы і публіцысты, якія шукалі вытокаў перамогі «аранжавых» ва Ўкраіне, цяпер прызнаюць, што разам зь іншымі фактарамі адной з галоўных прычын аранжавай рэвалюцыі была высокая нацыянальная сьвядомасьць яе шараговых удзельнікаў, якая дала вынік у выглядзе актыўнай грамадзянскай пазыцыі падчас лёсавызначальных для сваёй краіны падзеяў.

Аднак наўрад ці такі фактар у прагнозах адносна Беларусі ўлічваецца эўрабюракратамі з Брусэлю, а некаторым з нашых суседзяў ён наагул можа падацца небясьпечным.


HEATH HINEGARDNER. WALL STREET JOURNAL

# Капіталізм і ягоныя крызісы

Крызісы патрэбныя капіталізму як соль — супу, кажуць адны — і маюць на ўвазе нешта цалкам станоўчае. Капіталізм кульгае ад аднаго крызісу да наступнага аж да канчатковага свайго крызісу, кажуць іншыя.

Пачнем з апалягетаў капіталістычнага апакаліпсісу, з Карла Маркса, вялікага прарока крызісу капіталізму.

Паводле Маркса, сучасны прагрэсіўны капіталізм вылучаецца тым, што ў ім тавары ўрэшце больш не абменьваюцца на тавары, а пачынаецца гандаль грашыма ў абмен на грошы (Geld gegen Geld). У ягоным уяўленьні, з унутраных супярэчнасьцяў капіталізму вынікаюць пэрыядычныя крызісы, якія з часам становяцца ўсё больш цяжкімі і небясьпечнымі. Маркс меркаваў, што праблема ўласна будзе палягаць у тым, што стаўкі прыбытку па меры прагрэсіўнай рацыяналізацыі будуць пастаянна зьніжацца, а попыт на прадукты капіталістаў урэшце спыніцца — гэтае прадказаньне аказалася памылковым.

Зусім іншае бачаньне сытуацыі меў Ёзэф Шумпэтэр, які зрабіў шэраг найважнейшых тэарэтычных унёскаў у разуменьне сучаснага капіталізму.

Паводле Шумпэтэра, крызісы, узьнікненьне ды правал бізнэс-ідэяў, а таксама разбурэньне старых, аджылых сваё фірмаў, ёсьць непазьбежнай рысай капіталізму. Інавацыі, якія спрычыняюцца да «творчага разбурэньня», ёсьць рухавікамі падвышэньня дабрабыту.

### Чыгунка, інфармацыйныя тэхналёгіі і фінансавыя інавацыі

Найлепшы прыклад — чыгунка. Калі былі пабудаваныя першыя ўчасткі, укладальнікі ашалела кінуліся падпісвацца на акцыі чыгуначных кампаніяў. Курсы акцыяў рэзка ўзьляцелі ўверх, рынак перагрэўся — але пасьля таго, як высьветлілася, што дывідэнды далёка не адпавядаюць чаканьням, курсы абрынуліся. Многія ўкладальнікі страцілі ўвесь свой капітал. Але чыгунка, адна з наймагутнейшых інавацыяў прамысловай рэвалюцыі, выстаяла.

Падобна было з інтэрнэтнай эканамічнай бурбалкай і бурбалкай «новай эканомікі» на мяжы тысячагодзьдзя.

Новы рынак збанкрутаваў, а многія ўкладальнікі страцілі на ім усё, што мелі. Аднак спрычыненая дзякуючы штуршку інфармацыйных тэхналёгіяў інфармацыйная рэвалюцыя і, разам з тым, магутны прарыў у пляне чыстага падвышэньня дабрабыту — засталіся.

У працэсе крызісу рынак аддзяляе пустазельле ад жыта.

Канкурэнцыя дзейнічае як «працэс адкрыцьця» новага, кажучы словамі Фрыдрыха Аўгуста фон Гаека, які быў, відаць, найвялікшым пасьля Шумпэтэра тэарэтыкам рынку.

Гэтаксама і фінансавая галіна зазнала велізарныя інавацыі. Фінансавыя рынкі служаць таму, каб накіроўваць плыні капіталу на самыя прадукцыйныя мэты выкарыстаньня. Але над усім гэтым лунае цень няпэўнасьці: ніхто ня можа з пэўнасьцю прадказаць посьпех ці няўдачу інавацыяў і інвэстыцыяў. Да таго ж інфармацыя аб шанцах і рызыках даступная розным людзям у рознай ступені.

### Заганы рынку і дзяржавы накладаюцца

Пры ўсім пры тым фінансавыя рынкі больш схільныя да нестабільнасьці, чым таварныя.

Захопленыя інавацыямі ўкладальнікі схільныя да перабольшваньняў. У выніку ўтвараюцца бурбалкі, якія ўрэшце лопаюцца. За эпохай «Вялікага бычынага рынку» на Ўол-стрыт пасьледавала «чорная пятніца» ў кастрычніку 1929 году; за гадамі эканамічнага буму ў азіяцкіх «новых эканамічных тыграх» прыйшоў крах 1997—1998 гадоў. Чаму ж тады ў трыццатыя гады меў месца глыбокі і працяглы сусьветны эканамічны крызіс, тады як азіяцкія «новыя эканамічныя тыгры» хуценька ізноў ускочылі на ногі?

Адказ на гэтае пытаньне зьвязаны, мабыць, з рознай рэакцыяй адпаведных дзяржаваў: у трыццатыя гады большасьць урадаў шукалі паратунку ў моцным рэгуляваньні рынку; яны зачынілі межы для гандлю і хацелі цэнтралізавана вызначаць цэны і аб'ёмы вытворчасьці.

У Амэрыцы «Новы курс» Рузвэльта прывёў да дзяржаўнай апекі над значнымі часткамі эканомікі. Яшчэ ў 1936 годзе ровень беспрацоўя ў Амэрыцы складаў больш за 15 адсоткаў.

У Азіі ж урады паводзілі сябе ў 1997—1998 гадох стрымана; рынкі апусьціліся да самай ніжняй мяжы, і тады ізноў хутка ўступілі ў дзеяньне сілы росту. Сёньня раны таго азіяцкага крызісу загаіліся.

У кожным крызісе накладваюцца адно на адно заганы рынку і дзяржавы.

Цяперашні крызіс быў, з аднаго боку, спрычынены сквапнасьцю банкаў, якія распрацоўвалі складаныя фінансавыя прадукты, якія яны ўжо нават і самі больш не давалі рады зразумець і кантраляваць.

Аднак сюды дадалася і значная порцыя памылковых стымулаў з боку дзяржавы, як то танныя стаўкі рэфінансаваньня пасьля 2001 году.

### Шкодная дапамога

Акурат яны і зрабілі магчымым масавае ўзяцьцё крэдытаў і ўсё большыя магчымасьці для фінансавых інвэстыцыяў. Умяшаньне амэрыканскай Фэдэральнай рэзэрвавай сыстэмы ў 1998 годзе ў крызіс вакол банку LTCM стварыла да таго ж небясьпечны прэцэдэнт, бо цяпер банкіры-рызыканты маглі ў выпадку небясьпекі спадзявацца на дзяржаўную дапамогу. А бум у сфэры пабудовы жыльля ў Амэрыцы быў таксама і палітычна пажаданай зьявай; балазе, свой дом для кожнага быў задачай дзейных пры дзяржаўнай падтрымцы гіпатэчных канцэрнаў Fannie Mae і Freddie Mac.

Цяпер жа банкі падаюць літаральна шыхтамі. Урад у Вашынгтоне мусіць практычна нацыяналізаваць палову банкаўскае сфэры. Будучыя фінансавыя інвэстыцыі будуць рэгулявацца стражэй. Але тым самым канкурэнцыя як «працэс адкрыцьця» новага будзе абмежаваная настолькі, што кошт гэтага абмежаваньня, магчыма, перавысіць карысьць ад яго (пра што папярэджваў Гаек). Пакуль што капіталізм сам даваў рады выбрацца з кожнага свайго крызісу, а дзяржаўнае ўмяшаньне часта больш шкодзіла, чым дапамагала.

**Філіп Плікерт, «Франкфуртэр Альгемайнэ Цайтунг». Пераклаў Сяргей Богдан**

# Літсправаздача за сто гадоў

«Галасы з-за небакраю»: анталёгія пацьвердзіла, што найважнейшым з іншамоўных паэтаў для нас па-ранейшаму ёсьць Міцкевіч. Анталёгія выявіла і вузкія месцы беларускага паэтычнага перакладу — пераклады зь літоўскай. Ня вельмі каб багата — з ангельскай. Мала, але ёсьць — з арабскай, кітайскай, японскай. Піша Павал Касьцюкевіч.

### Неяк у Рыме пры сьціжме людзей незьлічонай...

Білінгвізм беларускіх аўтараў — відавочны факт. Напэўна, ніводзін зь іх яшчэ ад часоў Дуніна-Марцінкевіча ня быў аднамоўным. Тут ільга наракаць на цяжкую каляніяльную спадчыну, а можна плённа скарыстоўваць.

Міколу Гусоўскаму «неяк у Рыме пры сьціжме людзей незьлічонай» раптам закарцела распавесьці іншаземцам пра свае чыста ліцьвінскія перажываньні — паляваньне на зубра. Літаратурны пераклад таксама нараджаецца з думкі: «Як бы цікава гэта было нашым людзям». Перакладчыку павінна хацецца расьсьмяшыць, зьдзівіць, расчуліць суайчыньнікаў тымі чужымі радкамі, зь якіх ён сам колісь пасьмяяўся, зьдзівіўся, расчуліўся. Чужымі, якімі колісь яму зрабілася сваімі. Неяк у Менску пры сьціжме людзей незьлічонай...

А яшчэ, са словаў укладальніка анталёгіі паэзіі сьвету «Галасы з-за небакраю» Міхася Скоблы, пераклад — пераліваньне крыві з аднаго культурнага арганізму ў другі, своеасаблівае паэтычнае донарства. Дамамо толькі, што пераклад надае нацыянальнай культуры аб'ёмнасьць, не дазваляе ёй зьяжджаць да ўзроўню субкультуры.

### Сяджу за рашоткай у цямніцы гады...

Пераклад — добраахвотная катарга. Зазіраючы ў пастылыя слоўнікі і шукаючы трапныя мэтафары, перакладчык можа прабавіць месяцы, калі не гады. Але некаторым, такім як Пятру Бітэлю, легендарнаму перакладчыку, якога лёс у 1950 годзе запратарыў у сталінскі лягер, дзе ён і абеларусіў «Пана Тадэвуша», літаратурная катарга дазволіла перажыць катаргу насамрэчную. Ён пісаў на папяровых мяхах з-пад цэмэнту, а арыгінал штодзень вяртаў у хованку. У зборшага трагічнай гісторыі беларускага перакладу не абышлося і без кур'ёзаў. У 1935 годзе «Гамлет», абеларушаны Юркам Гаўруком, выйшаў без пазначэньня імя перакладніка (Юрка на той час быў арыштаваны, і яго імя было пад забаронай), нібыта Ўільям наш Шэксьпір тварыў адразу па-беларуску.

Анталёгія — сьвята найперш перакладніцкае. Перастваральніку тут — даніна павагі, ён узьняты на ровень культурнага героя.




**Укладальнік анталёгіі Міхась Скобла (зьлева) з перакладчыкам Сяргеем Шупам.**

Нездарма ў анталёгіі зьмест зроблены паводле імёнаў перакладнікаў, а ня аўтараў арыгіналу. У дадатак, каб ня быць перад іншамоўным вершам, як «чмель нязграбны перад кветкай пекнай», пачаткоўца можа вывучаць няпросты мэханізм літаратурнага перакладу з самых біяграфіяў перакладнікаў і анатацыяў, зробленых Міхасём Скоблам.

### Літва! Радзіма, як здароўе, дарагая!

Анталёгія яшчэ раз пацьвердзіла, што найважнейшым з іншамоўных паэтаў для нас па-ранейшаму зьяўляецца Міцкевіч. Кожнае новае пакаленьне перакладнікаў, штохвіліны зазіраючы ў найноўшыя польскія слоўнікі, з падрадкоўнікамі ці без, вяртаецца да Адама, што вярэдзіць неразгаданасьцю адметнага культурнага коду. Штомоцы выцягваючы свае жылы ў спробе вытлумачыць вялікага навагрудца, беларускія перакладчыкі нават перастуваюць мяжу дазволенага: ходзяць чуткі, што Язэп Семяжон, перакладаючы «Пана Тадэвуша», дадаў да паэмы 1500 абсалютна адсябешных радкоў.

Дарэчы, у зборніку багата прэзентаваная тутэйшая паэзія, якая пісалася не па-беларуску: ад польскамоўнага Яна Чачота да габрэйскамоўных Ізі Харыка і Гірша Рэлеса.

Анталёгія выявіла і вузкія месцы беларускага паэтычнага перакладу — пераклады зь літоўскай. Як жа мала мы ведаем пра паэзію краіны, зь якой у нас адзіныя гістарычныя сымбалі.




**Галасы з-за небакраю: анталёгія паэзіі сьвету ў беларускіх перакладах XX ст.** Склад. М. Скобла. Менск: Лімарыюс 2008 — 896 с. 1000 ас.

Зь іншага боку, у «Галасах» багата прадстаўленыя вершы тых замежнікаў, якія натхніліся беларускай рэчаіснасьцю або тутэйшымі краявідамі. Баўгарын Хрыста Бекрыеў (верш «Марк Шагал. Віцебск 1909 год») або расеец Андрэй Вазьнясенскі (вершы «Возера Сьвіцязь» і «Ода Дубу»).

#### Падлік галасоў з-за небакраю

Канечне, па вялікім рахунку, вершы ня лічаць як бычкоў, але...

Дык вось.

**Усё ў парадку** ў нас зь перакладамі польскай, украінскай, нямецкай і францускай паэзіі.

**Няблага** — зь перакладамі расейскай, баўгарскай, сэрбскай, грузінскай і гішпанскай паэзіі.

**Ня вельмі каб багата** — з ідыш, літоўскай, латыскай і ангельскай паэзіяй, а таксама зь перакладамі з клясычных моваў — лаціны і старажытнагрэцкай.

**Мала, але ёсьць** — з арабскай, кітайскай, японскай.

## АБ УСІМ ПАТРОХУ

### Літва перайшла да прафэсійнага войска

Міністар абароны Літвы Юозас Олекас падпісаў загад аб прыпыненьні прызыву на абавязковую вайсковую службу. 15 верасьня набыў моц адпаведны закон.

Цяпер літоўская Служба ўпраўленьня вайсковым прызывам будзе прызываць толькі на прафэсійную службу, да 2009 году Літва мае цалкам перайсьці да прафэсійнага войска. У Польшчы пераход да прафэсійнага войска заплянаваны на 1 студзеня 2010 году.

### Страсбурскі суд ізноў асудзіў Расію

Вынесена юбілейная, дзесяцітысячная пастанова Страсбурскага суду па правах чалавека. Яна абавязвае Расею выплаціць 38 тыс. эўра бацькам забітага ў 2002 годзе ў Чачні 20-гадовага Аюба Тахаева і аднавіць сьледзтва па гэтай справе.

Расея знаходзіцца на першым месцы па колькасьці скаргаў, што падаюцца ў Страсбурскі суд і на чацьвёртым — па колькасьці прайграных справаў.

### Таямнічы бой у сталіцы Туркмэніі доўжыўся тры дні

Амаль трое сутак праходзіла спэцапэрацыя сілавых структураў Туркмэністану ў Ашгабадзкім раёне «Хітраўкі». Паводле афіцыйных зьвестак, туркмэнскія праваахоўчыя органы ліквідавалі буйную групу гандляроў наркотыкамі. Байцы спэцаддзелаў штурмавалі завод па вырабе пітной вады «Крыніца», на тэрыторыі якога невядомыя стварылі нешта накшталт ўмацаванага раёну. Страляніна пачалася 12 верасьня ў першай палове дня. Вайскоўцы ачапілі ўвесь жылы масіў «Хітраўка». Да месца правядзеньня спэцапэрацыі былі падцягнутыя БТРы, БМП, танкі.

Страляніна сьціхла толькі бліжэй да абеду 14 верасьня.

Пры гэтым, як паведамляе сайт Паліт.ру, ліквідаваць супраціўленьне ўдалося толькі дзякуючы «актыўнай дапамозе» з боку расійскіх спэцслужбаў. Пры гэтым ФСБ і МУС РФ адмаўляюцца ад камэнтароў па гэтай тэме. Пра колькасьць ахвяраў урадавыя крыніцы не паведамляюць.

Незалежныя эксперты ставяць пад сумнеў афіцыйную вэрсію «змаганьня з наркатрафікам». Больш схільныя разглядаць іншую прычыну: раён «Хітраўкі» — бадай самы бедны ў туркменскай сталіцы. Акрамя таго, ён населены мусульманамі-шыітамі. Там жа знаходзіцца адзіны шыіцкі мячэт у Туркменіі. А гэтае цячэньне ісламу забаронена ўладамі. Таму верагоднай выглядае вэрсія «рэлігійных зачыстак».

### Эўрасаюз вылучае 1 млрд эўра Грузіі

Пра гэта паінфармавала Бэніта Фэрара-Вальднэр, эўракамісарка, адказная за адносіны з суседзямі. 500 млн эўра будзе ўзята з фондаў Эўракамісіі (ураду ЭС), яшчэ столькі ж вылучаць краіны.

### У Варшаве пачынаецца суд над генэралам Ярузэльскім

Апошняга камуністычнага лідэра ПНР вінавацяць ва ўвядзеньні ваеннага становішча ў 1981 г. Сам генэрал кажа, што пайшоў на гэты крок з мэтай пазьбегнуць уварваньня ў краіну савецкіх акупацыйных войскаў.

Ярузэльскаму зараз 84 гады, ён ужо некалькі год пакутуе ад захворваньняў сэрца. Дактары дазволілі яму ўдзельнічаць у судовых паседжаньнях ня больш за дзьве гадзіны ў дзень.

Разам з Ярузэльскім на лаве падсудных апынуліся экс-кіраўнік Польскай рабочай партыі Станіслаў Каня і былы міністар унутраных спраў Чэслаў Кішчак.

### Лось-Мэсэршміт

Тры аўтамабілі зьбіў з дарогі лось перад тым, як загінуць. Адбылося гэта адвячоркам каля Нясьвіжу. Кіроўца «Масквіча», які рухаўся з Гарадзеі, не пасьпеў зрэагаваць, калі лось выбег на дарогу. Машына адкінула лася на сустрэчную паласу пад колы грузавіка «Вольва», які ішоў з Нясьвіжу. «Вольва» кінуў лася зноў на другую паласу, дзе жывёла налящела на «Фальксваген».

Лось загінуў, людзі не пацярпелі, машыны патрабуюць рамонту.

### Калматае стварэньне — ужо пад Пухавічамі

Ля Мар'інай Горкі, што ў Пухавіцкім раёне, ужо дзясяткі людзей бачылі мядзьведзя-бадзяйно. У вёсцы Ніўкі выяўленыя таксама сьляды невялікага зьвера. Пэўна, ён яшчэ не разумее, што чалавек можа быць ворагам. Не ўцякае апантана і асабіста не выяўляе агрэсіі. Таксама яго бачылі ля возера Міхайлаўскае. На меркаваньне Андрэя Шахэмірава, малады мядзьведзь згубіў сваю маці, бо звычайна яны трымаюцца разам да 3-4 гадоў узросту малога. Бацька-мядзьведзь сям'ёй не займаецца.

### Фінскі студэнт забіў дзесяць чалавек

У выніку стральбы ў адным з каледжаў Фінляндыі (гарадок з 14 тыс. насельніцтва Каўхаёкі) 20-гадовы студэнт застрэліў мінімум дзесяць чалавек. Шмат параненых. Чаму ён адкрыў агонь невядома.

Потым нападнік стрэліў сабе ў галаву. У лістападзе мінулага году аналягічны выпадак здарыўся ў горадзе Туусла: тады ў мясцовай школе былі застрэленыя восем чалавек.

**МБ, паводле БЕЛТА, gazeta.ru, svislac.belarda.org, Эўрарадыё, bulletinonline.org, novonews.lv**

# Вольныя песьні




складанка, БМА–груп, 2008

«Чорны май», «Курапаты», «У горадзе чужых назваў».

Праект запісаны, змайстраваны ды спрадусаваны Андрэем Плясанавым, і ягоныя ж рукі з разарванымі кайданкамі на вокладцы. У складанцы ўзялі ўдзел сем бардаў, або музыкаў, здольных гучаць у фармаце аўтарскай песьні. Акром уласна лідэра P.L.A.N. тут пяюць Зьміцер Бартосік, аўтар славутага «Чарнобыльскага шляху» Кастусь Герашчанка, бялыніцкі блюзмэн Юры Несьцярэнка, Лявон Тышкевіч з Маладэчна, а таксама дэбютант Уладзь Крумін, лідэр гарадзенскага гурта «Здань». Жаночую бардаўскую песьню бароніць адна Таня Беланогая. На дыску — музыка шчырых пачуцьцяў, без надакучлівага ўжо сьцёбу. І тэмы барды ўздымаюць надзвычай сур'ёзныя, што бачна хоць бы з назваў кампазыцыяў «Чорны май», «Курапаты», «У горадзе чужых назваў». Крыху іронію можна ўлавіць хіба ў Бартосіка ў перапяяным «Вороне» Акуджавы. Нешта пасьля фільму «Містэрыя арганізму» яна сур'ёзна зусім не ўспрымаецца. Бартосік, дарэчы, перапеў на беларускі манер і Нікіціна. І ўсё ў перакладзе Барадуліна. Цікавы праект, зь якога можна атрымаць уяўленьне пра стан сучаснай аўтарскай песьні.

# Джамбібум




Жаваронкачкі, БМА–груп, 2008

Здольны ўвесьці слухача ў транс.

Дэбютны дыск ад аднаго з самых цікавых фолк-праектаў апошніх гадоў. «Джамбібум» робіць стаўку на натуральнасьць гучаньня ды наўмысьля абыходзіць увагаю здабыткі іншых прадстаўнікоў беларускага фолк-мадэрну. Пры ўсёй шматстайнасьці інструмэнтаў (склад гурта сягае 10—12 чалавек!) у песьнях анічога лішняга. Гэты «фолк-аркестар» сапраўды здольны ўвесьці слухача ў транс (перамотвайце на сярэдзіну песьні «Стукнула-грукнула»). Падобна, што інструмэнтальнай частцы «джамбімбумаўцы» надаюць асноўную ўвагу — практычна ў кожным іх творы можна пачуць доўгія інструмэнтальныя водступы, дзе музыкі даюць волю эмоцыям. Зроблена ўсё лёгка і ненавязьліва, а часам з жартаўлівым адценьнем («Песенька пра Казла» на рэгі-манер), таму і слухаць гэты альбом як мінімум прыемна.

# Сярога




Хроника парнишки с гомельских улиц, Go–records, 2008

Нібы прытаміўся.

Новы дыск рэпэра-нахабніка з Гомелю зроблены ўжо не з такім запалам, як прарыўны «Мой двор». Сярога не зьдзіўляе ды і, здаецца, такой мэты ўжо ня ставіць. Нібы прытаміўся ды стаў заднікам абранага шляху. Не адмовіўся ён канчаткова і ад стылістыкі «рускага народнага рэнбі», але песенька «Чики» выглядае пародыяй на самога сябе. Усю сваю моц Сярога дэманструе ў трох трэках — уражвае хуткаю чыткаю ў «Mon Ami», зараджае энэргетыкай у «Вторжении» і кранае лірычнасьцю ў «Квазимодо». У астатнім ня вельмі роўны альбом выйшаў. Без гламурнага налёту «Дыскамалярыі», але і бяз вулічнай кранальнасьці, як у «Маім двары». Цалкам магчыма, што на гэтым сапраўды трэба спыніцца.

# Merry Poppins




Do svidania, Вігма, 2008

Нягледзячы на прыгожыя кліпы, трывалыя сувязі ды актыўны піяр.

Альбом абсурдных манатонных песенек ад праекту, які, выглядае, так і ня здолеў заняць хоць якое месца ў беларускай музычнай прасторы, нягледзячы на прыгожыя кліпы, трывалыя сувязі ды актыўны піяр. Сама па сабе някепская падаецца задума поп-праекту, што складаецца з трох сёстраў, якія граюць ролю «дзевачак-прыпевачак», а потым раптам пераўтвараюцца ў такіх зьмяюк-спакушальніц. З ідэямі ў Merry Poppins нібы ўсё ў парадку, маглі б зачапіць колькі дзясяткаў тысячаў школьніц сьпевы кшталту «ты красівы, як карціна, врэдны як Бураціна…», голасам «як у Глюкозы» пад мінімалістычную электроніку. Толькі перанасычаная музычная прастора такімі праектамі. Тут ужо трэба ці на харызьме ды шанцаваньні выяжджаць, ці мець куды больш прыгожыя кліпы, куды больш трывалыя сувязі і зусім ужо нахабны піяр:). Паколькі нічога гэтага сёстры Берулавы ня маюць, то іх цяперашні праект мае ўсе шанцы скончыцца гэтак жа бясслаўна, як і папярэдні пад назвай «Мантана».

**Сяргей Будкін**

# Сьвет загінуў



Трагічна загінуў сьпявак гурта Svet Boogie Band, вядомы пад сцэнічным псэўданімам Сьвет. А звалі яго Сьвятаслаў Хадановіч.

У 2003 годзе гэты неардынарны блюзавы выканаўца стварыў гурт, які стаў блюз-калектывам №1 у Беларусі. Яны гралі чыкаскі блюз, клясычныя фартэпіянныя бугі, рамантычныя баляды.

У свабодны ад сваёй геніяльнай музыкі час Сьвет працаваў стаматолягам у Мядзеле, пакуль не прыйшлі гучныя посьпехі на найлепшых фэстах Эўропы.

Трапіў пад машыну... Яму было 28 гадоў.

# Загадкавы маэстра Плашына

У Вільні знайшлі збор старадаўняй беларускай музыкі.

У архівах Вільні музыказнаўцы Сьвятлана Немагай і Аляксей Фралоў выявілі дзясяткі музычных твораў аўтараў XVI—XIX ст., якія паходзяць зь Беларусі. У інтэрвію БелаПАН сп. Фралоў адзначыў, што асаблівую цікавасьць уяўляюць шматлікія сымфоніі і сэрэнады эпохі Моцарта. «Дагэтуль было прынята лічыць, што гэтыя жанры зьявіліся ў Беларусі толькі ў XX ст. Імёны таленавітых аўтараў гэтай музыкі былі загубленыя ў вірах гісторыі на 150 гадоў і сёньня вяртаюцца ў нашу музычную культуру. Дамінік Адамовіч, Ян Сакалоўскі, Ян Чамароўскі, кампазытары Зарашэўскі, Маркевіч, Плашына, Пятровіч, Руткоўскі, Чупрынскі, ананімныя аўтары — маэстра эпохі клясыцызму і раньняга рамантызму, якія ўпрыгожылі музычны краявід Беларусі канца XVIII — першай паловы XIX ст. яркімі сымфоніямі: вытанчанымі і грацыёзнымі, забаўляльнымі і, разам з тым, сур'ёзнымі», — сказаў Аляксей Фралоў.

Многія са знойдзеных музычных рукапісаў паходзяць з фальварку Забелы Верхнядзьвінскага раёну, дзе ажно да 1840-х гадоў дзейнічала выдатная музычная капэля пад кіраўніцтвам кампазытара і дырыжора Міхала Кавалеўскага.




Вернутых твораў аказалася настолькі шмат, што налета палянуецца правесьці фэстываль «Адраджэньне беларускай сымфоніі». І ўжо 25 верасьня 2008 году адбудзецца анонс гэтага фэстывалю. У выкананьні ансамбля салістаў «Клясык-Авангард» у Малой залі Белдзяржфілярмоніі прагучыць праграма «Мэлёдыі Радзівілаўскіх паркаў», складзеная з твораў Маця Радзівіла, Яна Абрахама Шульца, Міхала Клеафаса Агінскага. Прагучаць і тры сэрэнады загадкавага маэстра Плашыны з Полаччыны, аўтара шасьці сымфоній.

«Слухачоў чакае незабыўная музыка, атмасфэра таямнічых паркавых алей і спатканьняў у ціхіх альтанках, шоргат пышных крыналінаў чароўных дам, цёплае зіхаценьне сьвечак у строгіх кандэлябрах», — адзначыў А.Фралоў.

**БелаПАН**

### Невядомы твор Моцарта

Тым часам у бібліятэцы гораду Нант (Францыя) адшукаўся аркуш з цалкам невядомым творам Вольфганга Амадэя Моцарта.

Эрліх Ляйзэнгер, кіраўнік дасьледчага крыла «Міжнароднага Фонду Моцарта» ў Зальцбургу пацьвердзіў: «Хоць гэта і накід мэлёдыі, у якім адсутнічае гармонія і аркестроўка, але ўсё ж можна распазнаць яе. Мы маем завершаны музычны твор, напісаны клясыкам».

За апошнія 50 гадоў было знойдзена толькі дзевяць твораў, роўных паводле значнасьці гэтай знаходцы. Дарэчы, цудоўная знаходка — не вельмі каб знаходка. Ноты аркуш быў перададзены бібліятэцы нейкім Алоісам Фуксам у канцы XIX ст. Ужо тады аркуш быў каталагізаваны як твор, што належыць Моцарту, але з цягам часу пра каштоўны прэзэнт проста забыліся.

**ПК**

## СЬЦІСЛА

### Браян Адамс распачаў сусьветнае турнэ з Тбілісі

Вядомы канадзкі рок-музыка даў дабрачынны канцэрт у сталіцы Грузіі на плошчы Рыке. Выступ стаў, з прызнаньня музыкі, «сымбалічным жэстам міру». Канцэрт прайшоў 19 верасьня, на 40 дзён пасьля першай гібелі мірных грамадзянаў у канфлікце вакол Асэтыі.

У падтрымку міру музыка выступаў таксама ў Віетнаме, Пакістане, Ярданіі і на Шры-Ланцы.

### Памёр Рычард Райт

Сузаснавальнік Pink Floyd, клявішнік Рычард Райт памёр у панядзелак у сваім доме ад раку. Яму было 65 гадоў.

**МБ, lazy**

# Катарсіс

Хоць мы ўсё часьцей б'емся за ўраджай з дапамогай «джон дзіраў» зь «бізонамі», «Дажынкі» мы па-ранейшаму адзначаем па-пацёмкінску. Рэпартаж **Сямёна Печанка**.



**Пераможцы калгаснага спаборніцтва сабраліся на плошчы ля адбудаванага езуіцкага калегіюму.**

PHOTO.BYMEDIA.NET

Беларусы не адзіныя сярод народаў, што адзначаюць сьвята ўраджаю, аддаючы належнае людзям нялёгкай сялянскай працы. Аднак, хоць мы ўсё часьцей б’емся за ўраджай з дапамогай іхных «джон дзіраў» і «лексіёнаў» зь «бізонамі», свае дажынкі мы як і раней адзначаем па-пацёмкінску — з агульнадзяржаўным размахам ды традыцыйным прыхарошваньнем чарговай сталіцы ўраджаю.

### Брама гораду

Чыгуначны вакзал у Воршы прыемна дзівіць зручнасьцю і функцыянальнасьцю. Вакзальная кавярня ўяўляе зь сябе арыгінальнае спалучэньне традыцыяў і сучаснасьці: над стойкай з мэталапластыку і столікамі з крэсламі на танюткіх мэталічных ножках чырванее назва ўстановы — «Карчма пры дарозе». Над такімі рэчамі можна паразважаць за гарачай бульбачкай з кілбаскамі.

Кіруюся ў цэнтар, бо разьлічваю пабачыць выступ самі ведаеце каго. І тут жа чую, як развітваюцца два пэнсіянэры: «Ну, пабег я Лукашэнку сустракаць!»

Сьмяюцца. Іду ў тым жа кірунку па вуліцы Молакава. Ісьці даводзіцца па растоўчаных ходніках абапал трохпавярховікаў, сьвежапафарбаваных у колеры абрыкосаў, падмарожаных апэльсінаў і недасьпелай алычы. Побач вуркочуць шчасьлівыя ад нечаканай спажывы галубы — газоны не пасьпелі зазелянець і насеньне ляжыць неабароненае наверсе. Далей трапляю на вуліцу Міру. Яе да сьвята відавочна рыхтавалі раней. Пад нагамі расьсьцілаюцца ўвабраныя ва ўсебеларускую шэрую плітку ходнікі. З аконных рамаў пасьпелі змыць фарбу, і газоны тут, відаць па ўсім, пасеялі раней. Да прыдарожнай ліпы прытуліўся забыты кімсьці шуфель. Міліцыянты каля дарогі трапляюцца ўсё часьцей, а адзін зь іх нават гайдаецца ў маторцы на хвалях Аршыцы. Мо і вадалазы ёсьць? Па вуліцы ў адным кірунку сьцякаюцца крынічкі сем’яў і кампаніяў. З палёгкай разумею, што не памыліўся з маршрутам.

### Місія невыканальная

Нарэшце заўважаю наперадзе прыкметы сьвяткаваньня. Даносіцца музыка, у паветры вісяць некалькі гіганцкіх балёнікаў. Пераходжу вуліцу і спыняюся перад турнікетамі. Рэха ліпеньскага выбуху непазнавальна зьмяніла фармат усенародных сьвяткаваньняў. Чарга, да якой я далучаюся, выцягвае галовы і насьцярожана чакае фэйс-кантролю. Паказваю зьмесьціва заплечніка, чакаю вынікаў сьлізганьня мэталашукальніка ўсьцяж цела і шыбую да галоўнай сцэны. Тут чарга ля турнікетаў значна даўжэйшая і людзі ў ёй стаяць, не ў прыклад асноўнай масе, строга апранутыя. Прызнаюся, гэтым разам я адмыслова прыехаў на другі дзень «Дажынак», каб на свае вочы пабачыць выступ Лукашэнкі, і тут пачаў адчуваць выразную трывогу за посьпех мерапрыемства.

Так і ёсьць — уваход толькі па запрашальніках. «Я ж табе казаў, што сюды толькі калхозьнікаў пускаюць», — кажа дзядзька разгубленай кабеце. Тая яго папраўляе: «Не калхозьнікаў, а пабядзіцеляў».

На VIP-стаянцы спыняецца бялюткі BMW, зь якога выходзіць мітрапаліт Філарэт. Каля чаргі, у якую мне не давялося стаць, зьяўляюцца кіраўнікі дзяржаўных тэлеканалаў. Спыняюцца, нядоўга разважаюць і... займаюць месца.

Перажыўшы фіяска з галоўнай стравай мэню, вырашаю перайсьці да дэсэрту — наперадзе падворкі, канцэртныя пляцоўкі і горад майстроў. Нырцую ў натоўп.

### Пяцікілямэтровы фэстываль

Размах сёлетніх «Дажынак» уражвае — агульная працягласьць вуліцаў, на якіх разьмясьціліся гандлёвыя і забаўляльныя аб’екты, сягае за пяць кілямэтраў. Уласьнікі «падворкаў» з розных куткоў Беларусі ад году да году кшталтуюць майстэрства афармленьня сваіх пляцовак. З розным посьпехам, вядома. Так, на адной зь іх «растуць» баравікі ў калена вышынёй, між якіх хаваецца шэры воўк, што пабываў на прыёме ў таксідэрміста. Уражаны, спыняюся і дастаю фотаапарат. «Казала ж табе, што гэтую фігню ўсе фатаграфаваць будуць!» — кідае гаспадыня пляцоўкі свайму калегу, відаць, аўтару ідэі. Але сярод кічу і прымітыву трапляюцца сапраўдныя пэрліны, як, напрыклад, віцебскі падворак. Зразумела ж, паўсюль прысутнічае сымболіка ўраджаю — снапы збожжа і лёну, кошыкі з гароднінай, гарбузы. Госьці фэстывалю ахвотна фатаграфуюцца побач з надзьмутымі ў рост чалавека рыбінамі, гіпсавымі і гумовымі парсюкамі, а таксама каля гіганцкага яйка, што прэзэнтуе мясцовую птушкафабрыку.

Над галавой чуецца гук верталёту. «Бацька ляціць!» — усьміхаюцца людзі. Два захмялелыя дзецюкі шчэраць моцныя зубы: «Коля, ты ж там недзе служыў. Ці можна «вяртушку» з гранатамёту зьбіць?».

Падыходжу да атракцыёну, што прапануе кожнаму вымераць, наколькі прырода надзяліла яго сілай. У залежнасьці ад таго, як моцна ўдарыш кувадлай па мэталічным пні, хітры апарат называе цябе «чайнікам» або «дзецюком», а як пастарацца, то й «монстрам», ці ўвогуле — «кінг-конгам». «Вася, а ты ня хочаш ё...ць? Паглядзім, хто ты — монстар ці кінг-конг», — сьмяецца загарэлы мужык. Вася змрочна адмаўляецца: «Няма здароўя пасьля ўчарашняга». Рухаюся далей. Прарэзьлівым сыгналам разразае натоўп дзіцячы цягнік. І малеча, і бацькі ў непадробным захапленьні. Для дзяцей тут ёсьць яшчэ шмат забавак — ад пракату дзіцячых аўто, да гамакоў і горак.

Спыняюся ля павільёну менскіх лазьняў. Тут ладзіцца конкурс на самага трывалага аматара гарачай пары. Паўдзясятка добраахвотнікаў прайшлі мэдычны кантроль і зьніклі за дзьвярыма парылкі. Судзьдзі прыляпіліся да вокнаў, зазывала камэнтуе ў мікрафон: «Прайшло дзьве хвіліны і ім яшчэ падабаецца. Але хутка на камяні лінуць вады... Гарэлку і шашлыкі вы ўбачыце кожны дзень, а нашу пару і прызы для пераможцаў — толькі тут і цяпер». Штопраўда, п’яных амаль не відно. Міліцыянты выпраўляюць ненадзейных у адзін канец за турнікеты.

### Мажорысты катарсіс

У Горадзе майстроў мяне засьпявае вітальнае слова Лукашэнкі. Ягоны голас даносіцца з рэпрадуктараў, што вісяць тут ці не на кожным слупе. Шмат хто застыў на месцы, слухаючы словы пра заслугі хлебаробаў, пра новую і сучасную Воршу, што стала такой дзякуючы «Дажынкам». Затым прамову перакрыў запіс расейскай поп-зоркі з бліжэйшай пляцоўкі.

Толькі што скончыўся выступ фальклёрнага калектыву «Катарсіс», што належыць да спартова-аздараўленчага цэнтру «Мажор».

Потым на сцэну выйдзе не адзін творчы калектыў, а вядоўцы раскажуць усім ахвочым пра тое, што беларускі гаспадар «і рахманы, і памяркоўны, і працавіты, і кемлівы». Будзе й абавязковае навязлае ў зубах «падзякуем нашых выступоўцаў». Сытуацыю ратуюць маленькія калектывы на маленькіх жа пляцовачках, што знай сабе сьпяваюць без дапамогі безгустоўных вядоўцаў, ды зьбіраюць ля сябе ўдзячную публіку. Прыемным адкрыцьцём робяцца маладыя людзі ў скураных куртках, што зухавата танчаць польку пад гармонік.

### Наша краіна — Беларусь

У Горадзе майстроў трапляю на выставу музыкі зь Менску Ўладзімера Пузыні. Той дзеліцца сваімі назіраньнямі: людзі ахвотна набываюць беларускі прадукт — ад музыкі ВКЛ, да твораў сучасных выканаўцаў. Дзівяцца, пабачыўшы беларускамоўнага Шрэка на DVD.

«Рана нашаму ўнуку казкі на мове даваць, дайце нам сказкі», — кажа бабуля.

Сп. Уладзімер парыруе — а дзе мы з вамі жывем?

«Правільна!» — дзед нечакана прымае бок гандляра і прымушае капітуляваць старую. На імправізаваным прылаўку дыскі беларускіх выканаўцаў суседнічаюць з запісамі расейцаў. Гаспадар тлумачыць гэта камэрцыйнай мэтазгоднасьцю. На свае вочы бачу, як ладная частка пакупнікоў, пашукаўшы сярод Антонавых, набывае ўрэшце штосьць зь беларускага.

Рэшту дня псуе дождж — спачатку дробны, але з кожнай хвілінай ён робіцца ўсё больш настойлівым. Людзі на сьвяточных вуліцах хаваюцца ў шашлычны дым намётаў, у крамы, што карыстаюцца момантам і працуюць у выходны дзень. Але шмат каго капрызы надвор’я не палохаюць, і ля канцэртных пляцовак, дзе маюць адбыцца заключныя выступы, зьбіраюцца купкі людзей. Я ж зьбіраюся ў зваротны шлях — сп. Пузыня гасьцінна прапанаваў мне месца ў сваім аўтобусіку. Заяжджаем зірнуць адным вокам на Дняпро і кіруемся ў Менск.

### Калькулятар

А цяпер на хвілінку зазірнем у наш агульны гаманец-бюджэт. Чаго каштавалі Дажынкі — гіганцкая піяр-акцыя адной палітычнае групоўкі напярэдадні выбараў, фінансаваная зь дзяржбюджэту?

На працы па добраўпарадкаваньні Воршы было выдаткавана 319,4 млрд рублёў (каля 100 млн эўра, для параўнаньня — у мінулым годзе ў Рэчыцы было выдаткавана 100 млн даляраў).

І гэта пры тым, што людзі працавалі за паўзаробку, а матэрыялы пастаўляліся па выгадных цэнах. Сюды з усёй Беларусі сьцягнулі амаль 4,5 тысячы чалавек. Да сьвята былі ўпарадкаваныя больш за 700 аб’ектаў.




Полечка-трасуха.




Працаваў на «Дажынках» і вулічны павільён лазьняў.

# на «Дажынках»




Бай-трэш. Фантазія ў афармленьні падворкаў ня мае межаў.

## Галасуй! Галасуй!

**Крыніца ў міліцыі запэўніла, што існуе шэраг дакумэнтаў, згодна зь якімі працаўнікоў прадпрыемстваў, дзяржаўных служачых, навучэнцаў, якім споўнілася 18 гадоў, будуць абавязваць галасаваць раней за непасрэдны дзень выбараў.** Мой суразмоўца пацьвердзіў, што супрацоўнікі міліцыі ня будуць выключэньнем і мусяць прагаласаваць датэрмінова.

**Алесь М., Салігорск**

## Хрысьціянаў трэба глядзець і глядзець

**Сустаршыня аргкамітэту па стварэньні БХД Аляксей Шэін падчас перасячэньня літоўска-беларускай мяжы 19 верасьня быў затрыманы беларускімі памежнікамі.** На Аляксея быў складзены пратакол асабістага агляду. Памежнікі пераглядалі асабістыя рэчы палітыка і шукалі ў яго кампутар.

Апошнім часам Павал Севярынец, Віталь Рымашэўскі, Аляксей Шэін, Георгій Дзьмітрук – усе сустаршыні аргкамітэту па стварэньні БХД – сутыкнуліся з затрыманьнямі на мяжы і складаньнем пратаколаў асабістага агляду.

**Хрысьціянскі дэмакрат**

## «Падрыўнікоў» шукаюць ужо і сярод школьнікаў

**Я вучуся ў клясе з хіміка-біялягічным профілем, выпускнік, а таму маю мала вольнага часу.** Удзельнічаў у алімпіядзе па хіміі.

Я і дзьве мае аднаклясьніцы сёньня атрымалі паведамленьне, што нас здымаюць з заняткаў для таго, каб мы паехалі ў менскі аддзел па барацьбе з арганізаванай злачыннасьцю і пакінулі там заявы. Пытаньні: дзе і што мы рабілі 3 ліпеня гэтага году. Акрамя гэтага трэба будзе здаць адбіткі пальцаў. Мы ня можам стрымаць свайго абурэньня, бо мы, найлепшыя навучэнцы, павінны трываць яшчэ адну (акрамя «рэформы адукацыі») абразу. Вучні адной клясы сёньня ўжо езьдзілі, шмат хто адмовіўся пакідаць свае зьвесткі ў МВД.

**Антон, Менск**

* * *

**Калі міністар Навумаў ці хто там яшчэ выдаў загад, паводле якога сотні тысяч менчукоў павінны прайсьці праз «органы», каб здаць свае адбіткі пальцаў і сьліну, то гэты загад датычыць «органаў».** Ні міністар, ні нават гарант ня могуць загадаць нам ісьці ў гэтыя «органы».

Я здагадваюся, навошта патрэбныя адбіткі. У КДБ і МУС ёсьць дасье блізу на 3 млн грамадзян Беларусі. Для поўнага камплекту «органам» не хапае якраз адбіткаў пальцаў і ДНК.

Я зьвяртаюся да праваабаронцаў з просьбай: запатрабуйце, каб загад Навумава ці каго там яшчэ быў даведзены да агульнага ведама.

**Анатоль Сідарэвіч, Менск**

## Выпускаюць парафіны без ачыстных збудаваньняў

**Жыхары пасёлкаў Дружны і Сьвіслач Пухавіцкага раёну вядомыя сваім змаганьнем супраць пабудовы хімічнага прадпрыемства расейскай фірмы «Август».** Аднак, покуль яны пільнавалі «інвэстараў з суседняй краіны», непрыемны сюрпрыз ім падрыхтаваў мясцовы вырабнік: у інтэрвію БЕЛТА дырэктар заводу горнага воску Валеры Мулярчык пацьвердзіў інфармацыю пра пачатак выпуску нафтавага парафіну «па часовай схеме» — без ачыстных збудаваньняў.

Спадар Мулярчык адзначыў, што ўжо выпушчана першая партыя прадукцыі памерам 70 тон. А да канца году (фактычна за 3 месяцы) ЗГВ плянуе «накрышталізаваць» яшчэ 700 тон. Устаноўка запушчана каля месяца таму. Знаходзіцца яна на чыгуначнай плятформе ў лесе паміж Дружным і Сьвіслаччу, практычна пад адкрытым небам і без абсталяваных пляцовак часовага захоўваньня сыравіны й адкідаў.

**svislac.belarda.org**

## Аддалі даніну павагі

**У Маладэчне адбылася навукова-краязнаўчая канфэрэнцыя «Шляхамі Вацлава Ластоўскага».** Натхняльнікам яе правядзеньня зьявіўся краязнаўца Міхась Казлоўскі. Кожны зь пятнаццаці дакладчыкаў уносіў нешта сваё ў сказе пра Власта. Шырока была прадстаўлена і геаграфія ўдзельнікаў: Вілейка, Горадня, Крэва, Маладэчна, Менск, Слонім, Смаргонь.

Мяне ўразіла ўвага залі, канцэнтраванае слуханьне выступоўцаў. Заля дарэчы, была перапоўненая: навукоўцы, выкладчыкі, настаўнікі, студэнты, навучэнцы, пэнсіянэры… Работнікі бібліятэкі ўсё падстаўлялі і падстаўлялі крэслы…

Доўга, па-сапраўднаму шырока, ва ўвесь голас не было чуваць Вацлава Ластоўскага на Крэвіі–Беларусі. Дык хай жа ён вяртаецца годна, з павагай. Памяць пра таленавітага ідэоляга адраджэньня роднай зямлі, таленавітага навукоўца і творцу, сьлыннага сына Радзімы — спамінайма яго часьцей!..

**Сяргей Брадавы, Маладэчна**

## Вадзяны вятрак

**У сярэдзіне верасьня Жодзіна адсьвяткаваў 365-годзьдзе, адзначыў дату, якую многія месьцічы яшчэ зусім нядаўна нават і не ўяўлялі.**

У праграмцы сьвяточных мерапрыемстваў кожны жодзінец і госьць гораду па-над Плісаю мог адшукаць, як у вабным мэню, пачастунак сабе пад густ. Ад урачыстага мітынгу «БелАЗ — наш гонар!» да канцэрту сярэднявечнай музыкі. Ад ускладаньня вянкоў да мэмарыялаў і помнікаў вайсковай славы да коннага рыцарскага турніру. Ад пасадкі алеі гарадоў-пабрацімаў да тэатра вогненных пэрформансаў. Ад цырымоніі адкрыцьця фантану на галоўнай алеі гарадзкога парку да бугуртаў — тэатралізаваных гістарычных боек. Ад мастацкай выставы «Мой горад старадаўні — мой горад малады» да адкрыцьця на вуліцы Багуслаў Поле памятнага знака «Вятрак»…

Але стоп! Агульнавядома, што круціць жорны млынаветрака мусяць ягоныя крылы. Сапраўдны ж колішні жодзінскі млын стаяў непасрэдна на Плісе і, натуральна, быў млынам вадзяным! І млын, адноўлены ў лялечна-паркавым выглядзе і памеры, мае і вадзяное кола, якое да плыні Жодзінкі ня тое, што не дастае, але і стаіць упоперак рэчкі. Прычым стаіць і ў літаральным сэнсе! А як хораша было б, каб кола тое круцілася, сымбалізуючы гараджанам і рух часу, і дабрабыт!

Непаразуменьне выклікаюць і іншыя «артэфакты» падворка млынара. Дахі будынін з гарызантальна насьцеленых дошак, хаця просіцца на іх гонта ці трысьнёг. Студня-жораў, з якой не зачэрпнеш вады, сьвіран, у які ня зойдзеш, бельмаватыя вокны, у якія не зазірнеш…

Уражаньне, што рабілася ўсё гэта пасьпешліва, па-аматарску. Ратуе сытуацыю хіба памятны знак разьбяра Ўладзімера Глазуна. Хай сабе і не вельмі пісьменна (занадта ўжо вытыркаюцца вушы расейскага чынавенскага канцылярыту!), сьведчыць ён, што «365 год таму назад на злучэнне Плісы і Жодзінкі Багуславам Радзівілам заснавана мястэчка Багуслаў Поле, якое паклала пачатак гораду Жодзіна».

Ды ўсё ж хочацца спадзявацца і верыць, што менавіта ад яго ў школьнікаў будуць пачынацца ўрокі жодзіназнаўства, што менавіта да яго (а не да глыбока трагічнага помніка маці-патрыёткі, якая, паводле савецкай міфалёгіі, аддала на вайну пяцёх сыноў!) неўзабаве павязуць кветкі шчасьлівыя маладзёны.

**Уладзімер Сіўчыкаў**




**Гэта не архіўная хроніка. Такі лёзунг вісіць у Слуцку, у гімназіі № 1.**

## Мабільнікі — пра гаспадароў

**Што будзе, калі папрасіць чалавека назваць першае слова, што прыйшло яму да розуму?** Псыхолягі кажуць, што ад гэтага можна дазнацца пра характар чалавека, яго ўнутраны сьвет. Гэта кшталту мэлёдыі на мабільным тэлефоне: чалавек ставіць яе для сябе, не разьлічваючы, што яна будзе кімсьці пачутая, — а гэта ўжо само па сабе выкрывае сапраўднае «Я» карыстальніка… Мы ж чуем мэлёдыю!

Так, напрыклад, калі гэта ёсьць звычайны званок (помніце, як на старых добрых савецкіх тэлефонах), дык хутчэй за ўсё чалавек зьяўляецца кансэрватарам; калі то аднекуль запампаваная паліфанія, дык, імаверна, чалавеку хочацца хаця б нечым вылучыцца — паказаць сваё выключнае, як яму здаецца, «Я».

Але! У мяне на тэлефоне стаіць «Палянэз Агінскага №13». Не, ня тое, што я не магу пражыць ні хвіліны без гэтай кампазыцыі, але на месцы гэтага шэдэўра я магу ўявіць толькі гімн Незалежнай і Моцнай Беларусі… праўда, каб быў такі гімн… каб існавала ўвогуле такая Беларусь…

**Mikalai Tamaszevicz**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

## Беларускі Калегіюм абвяшчае набор

**Беларускі калегіюм прапануе дадатковае навучаньне па спэцыялізацыях: журналістыка, найноўшая гісторыя, філязофія/літаратура.**

Запрашаюцца студэнты старэйшых курсаў альбо асобы з вышэйшай адукацыяй. У выключных выпадках прымаюцца студэнты малодшых курсаў. Навучэнцамі БК могуць быць тыя, хто пастаянна альбо на час навучаньня пражывае ў Менску.

Навучальныя праграмы БК арыентаваныя на выкладаньне найноўшых фрагмэнтаў сучаснай веды і не дублююць наяўныя праграмы дзяржаўных і недзяржаўных унівэрсытэтаў.

Сэртыфікат Калегіюму не замяняе дыплёму аб вышэйшай адукацыі.

Навучаньне ў БК — бясплатнае. Пачатак заняткаў з 6 кастрычніка 2008 г.

Запіс на сумоўе па 29 верасьня.

**Дадатковая інфармацыя: (029) 276-27-15, 679-26-82 з 14.00 да 18.00 (акрамя суботы і нядзелі) ці праз kalehium@gmail.com.**

## «Дзеяслоў» ладзіць конкурс крытыкаў

**Часопіс «Дзеяслоў» абвяшчае конкурс літаратурна-крытычных твораў на тэму: «Беларуская літаратура XXI стагодзьдзя: постаці, тэндэнцыі, пэрспэктывы».**

Да конкурсу прымаюцца літаратурна-крытычныя артыкулы, эсэ, рэцэнзіі, якія асьвятляюць сучасны літаратурны працэс. Да ўдзелу запрашаюцца маладыя крытыкі і літаратуразнаўцы, якія пішуць на беларускай мове. Для пераможцаў конкурсу будзе зладжаны сэмінар з майстар-клясамі вядомых беларускіх літаратараў і крытыкаў.

Па выніках конкурсу будзе выдадзена кніга.

Склад журы конкурсу: Міхась Тычына, Алесь Пашкевіч, Сяргей Дубавец, Ірына Шаўлякова, Анатоль Івашчанка.

Тэрмін падачы твораў: з 1 верасьня 2008 да 1 лютага 2009 г.

Дасылаць творы можна ў электронным (пажадана) ці рукапісным выглядзе на адрасы: **dzieja-konkurs@tut.by або 220025, г.Менск-25, а/с 91 з пазнакай «на конкурс».**

## Стыпэндыі для беларускіх студэнтаў

У 2009 годзе Міжнародны Вышаградзкі Фонд рэалізуе спэцыяльную праграму для Беларусі. Праграма прапануе беларускім студэнтам і навукоўцам 80 сэмэстраў навучаньня ў любым дзяржаўным ці прыватным унівэрсытэце краін-удзельнікаў Вышаградзкай Групы. Дадатковая інфармацыя — на сайце http://www.visegradfund.org/scholarships.html.

Вышаградзкая Група (таксама вядомая як Вышаградзкая Чацьверка, у скарачэньні па-ангельску V4) зьяўляецца рэгіянальным саюзам чатырох цэнтральнаэўрапейскіх дзяржаваў — Чэскай Рэспублікі, Рэспублікі Вугоршчына, Рэспублікі Польшча і Рэспублікі Славакія.

Стварэньне Групы было ініцыявана 15 лютага 1991 г. на сустрэчы прэзыдэнта Чэхаславакіі Вацлава Гаўла, прэзыдэнта Польшчы Леха Валэнсы і прэм'ер-міністра Вугоршчыны Юзэфа Антала. Пасьля падзелу Чэхаславакіі на дзьве незалежныя дзяржавы Вышаградзкая Група стала Вышаградзкай Чацьверкай.

Ідэя сустрэчы 1991 году менавіта ў Вышаградзе (паўночная частка Вугоршчыны) была натхнёная ідэяй сустрэчы, якая праходзіла тут у далёкім 1335 г. Тады Вышаградзкі замак прымаў трох палітычных лідэраў рэгіёну — караля Багеміі, караля Вугоршчыны і караля Польшчы. Тая сустрэча стала падмуркам для мірнага існаваньня і сумеснай эканамічнай палітыкі трох дзяржаваў.

Стварэньне Вышаградзкай Групы ў 1991 годзе асноўвалася на прынцыпах салідарнасьці і агульных каштоўнасьцяў, такіх, як сучасная праўовая дзяржава, парлямэнцкая дэмакратыя і рынкавая эканоміка.

У 2004 годзе чатыры дзяржавы Вышаградзкай Групы сталі членамі Эўрапейскага Саюзу. Пасьля дасягненьня гэтай ключавой мэты — уваходу краін у эўраструктуры — Вышаградзкая Група пачала распрацоўваць і ажыцьцяўляць сумесную палітыку ў дачыненьні да суседніх дзяржаваў, падзеленых калісьці «жалезнай заслонай». Прыярытэтам дзяржаваў сталі дзяржавы, якія бяруць удзел у Эўрапейскай палітыцы добрасуседзтва, а таксама дзяржавы за ўсходнімі межамі Групы, такія, як Беларусь, Украіна і краіны заходняй часткі Балканаў.

Міжнародны Вышаградзкі Фонд быў заснаваны ў 2000 годзе ў якасьці адзінай інстытуцыі Вышаградзкай Групы, місіяй якога было фінансаваньне розных праектаў у галіне культуры, адукацыі, навуковага абмену, абмену моладзьдзю, прымежнага супрацоўніцтва і папулярызацыі турызму. На дадзены момант дзейнічае 4 праграмы грантаў, 3 адукацыйныя праграмы і творчая праграма, якія рэалізуюцца ў 11 тэрмінах.

Галоўнымі ўдзельнікамі грантавых праграм зьяўляюцца няўрадавыя некамэрцыйныя арганізацыі, муніцыпалітэты і асобныя грамадзяне. Вышаградзкая Група ня мае сакратарыяту, а яе дзейнасьць каардынуецца міністрамі замежных справаў. Адзінай інстытуцыяй зьяўляецца Міжнародны Вышаградзкі Фонд. Фонд быў заснаваны ўрадамі чатырох краін-удзельніц 9 чэрвеня 2000 году. Галоўнай мэтай Фонду зьяўляецца дзейнасьць, скіраваная на разьвіцьцё супрацоўніцтва краін Вышаградзкай Групы зь вялізарным рэгіёнам Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы, а таксама заходніх Балканаў. Бюджэт Фонду складае 5 млн эўра і складаецца з унёскаў краін-удзельніц Групы.

Ад 2007 году Фонд прапануе праграму Вышаградзкіх Унівэрсытэцкіх грантаў (Visegrad University Studies, ці Curriculum Program), мэтай якой зьяўляецца разьвіцьцё і паляпшэньне унівэрсытэцкіх адносінаў і праграм у Вышаградзкім рэгіёне.

Больш за тое, Фонд рэалізуе адукацыйныя праграмы ня толькі для зацікаўленых асобаў з краін Групы, але і для навучэнцаў з наступных краін: Альбанія, Армэнія, Азэрбайджан, Беларусь, Боснія і Герцагавіна, Харватыя, Грузія, Македонія, Чарнагорыя, Расея, Сэрбія ды Ўкраіна. Ад 2003 году больш за 500 навучальных візытаў рознага ўзроўню было фінансавана Вышаградзкім Фондам. Навучэнцы з краінаў, якія не ўваходзяць у Вышаградзкую Групу, могуць свабодна абіраць дзяржаўную ці прыватную вучэльню (зарэгістраваную ў Міністэрстве Адукацыі) у любой з краін Групы.

# Канец
## шасьцідзясятніцкіх
# ілюзій

Камунізм, у сэнсе ліквідацыі перажыткаў і поўнага дабрабыту, надышоў не ў 1980 годзе, а недзе ў 2005-м, і не ва ўсім Савецкім Саюзе, а толькі на тэрыторыі сувэрэннай Рэспублікі Беларусь. І тады выявілася, што людзям не патрэбная ўся праўда. І нават каліўца яе не патрэбна, калі ім жывецца добра. Піша **Віталь Тарас**.

### Сьмешны анахранізм

У дзяцінстве многія словы падаюцца сьмешнымі. Мне, напрыклад, падавалася забаўным слова «анахранізм». Адкуль было ведаць у дзяцінстве, што анахранізм як зьмяшэньне эпохаў, як несупадзеньне твайго індывідуальнага адчуваньня часу з гістарычным — гэта жахлівая рэч. За часам Хрушчова пад анахранізмам разумеліся, звычайна, «перажыткі» — царква, народныя звычаі, мова. Усё тое, што перашкаджала савецкім людзям на шляху да камунізму. Пэрсанальна Хрушчову (свайго роду Пуціну 1960-х гадоў мінулага стагодзьдзя) на гэтым шляху заміналі ўсе нацыянальныя мовы — у тым ліку беларуская, якія павінны былі хутка адмерці. Першы сакратар ЦК КПСС, ён жа — Старшыня Прэзыдыюму Савету Міністраў СССР, крыху памыліўся ў тэрмінах. Камунізм, у сэнсе ліквідацыі перажыткаў і поўнага дабрабыту, надышоў не ў 1980 годзе, а недзе ў 2005-м, і не ва ўсім Савецкім Саюзе, а толькі на тэрыторыі сувэрэннай Рэспублікі Беларусь. Праўда, РБ як бы ўваходзіць у склад «саюзнай дзяржавы Расеі і Беларусі», але гэта толькі даводзіць справядлівасьць яшчэ аднае тэзы — камунізм сатрэ ўсе межы.

Справа не ў абстрактным прынцыпе: «ад кожнага паводле здольнасьцяў, кожнаму — паводле патрэбаў». Справа ў практычнай рэалізацыі мараў савецкага чалавека. Хочаш аўтамашыну, ды яшчэ імпартную — калі ласка! Хочаш кватэру ў горадзе ці пабудаваць дом — і гэта мажліва яшчэ пры тваім жыцьці, а не ў «цудоўнай далечыні». Ёсьць мабіла апошняй мадэлі, зь якой можна пасылаць MMC з выявамі шчасьлівага жыцьця, ёсьць гарэлка, ёсьць бульба з салам, ёсьць піва «Аліварыя» і «Кока-Кола», зробленая ў Беларусі. Усё на любы густ і смак. Пра што можна яшчэ марыць!

Вось, скажа нехта, яшчэ адзін стары корч будзе бурчэць пра тое, што ў маладосьці дрэвы былі зелянейшыя і сонца ярчэйшае. У апошнім зусім ня ўпэўнены, калі меркаваць па зьменах клімату. А вось што мары ў майго пакаленьня былі нейкія іншыя, і адчуваньне часу...

### Гарачыя клявішы

Пісаць пра пачуцьцё «дэжавю» ў гісторыі ўжо зрабілася штампам, агульным месцам. Падзеі на Каўказе, караблі НАТО ў Чорным моры, савецкія стратэгічныя бамбавальнікі ў Вэнэсуэле (гэта не абмылка — яны ж былі выраблены яшчэ ў СССР). А там і флягман расейскіх ВМС «Пётра Вялікі» падплывае да Карыбаў. І вось ужо ўсе пачалі згадваць Карыбскі крызіс, 1962 год, сьвет на парозе Трэцяй усясьветнай вайны…

А ўсё-ткі, дальбог, ня цягне Буш-малодшы на Джона Кэнэдзі, а Робэрт Гэйтс (ня блытаць зь Білам Гэйтсам!) на Джона Макнамару. І «нацыянальны лідэр» цяперашняй РФ на ролю Мікіты Хрушчова ня цягне. Ну, ня цягне, нягледзячы на мускулісты торс, валоданьне дзюдо, нямецкай мовай і ўменьне ўстаўляць у свае выступы падрыхтаваныя загадзя фірмовыя нарыхтоўкі кшталту «мачыць у сарціры», «размазваць соплі», «зробім абразаньне»...

Іншая справа, што і Сарказі — не дэ Голь, і Сара Пэйлін — зусім ня Маргарэт Тэтчэр, хоць кандыдатку ў віцэ-прэзыдэнты ЗША пачалі параўноўваць ужо з жалезнай лэдзі...

Калі малапісьменны Хрушчоў заяўляў з трыбуны: «мы вас закапаем» («сацыялізм закапае капіталізм»), на Захадзе з рэальным жахам разумелі, што СССР можа гэта зрабіць, — адправіць увесь сьвет у апраметную. У ЗША 45 гадоў таму ўсур'ёз рыхтаваліся да ядравай вайны. І дзеці там развівіталіся з сваімі бацькамі, кладучыся спаць, — «назаўсёды». Бо заўтра магло не наступіць ніколі.

Парадаксальна, але сёньня такога адчуваньня ўжо няма. (Вось характэрны жарт з папулярнага сайту bash.org: у інтэрнэт-краме пабачыў кнігу «Ядравыя кнопкі. Прыёмы эфэктыўнай працы з выкарыстаньнем гарачых клявішаў». Гэта як? Калі вам лянота выбіраць па адной краіне са сьпісу, націсьніце Ctrl+A і Enter.) Ядравая зброя ўжо не падаецца гарантыяй неразьвязваньня сусьветнай вайны. Узаемнае гарантаванае зьнішчэньне? А можна ж ваяваць і без ядравай зброі і пры гэтым усё адно «забіць шмат людзей», як жартавалі амэрыканскія генэралы ў добрыя старыя часы.

Спробы Расеі заявіць пра свае імпэрскія амбіцыі і прынцыпы (не лезьце ў НАША мора і на НАШ Каўказ, і мы не палезем у ВАШУ Атлянтыку) заснаваныя не на тым, што ваенна-прамысловы патэнцыял краіны вырас у разы за кошт звышпрыбыткаў ад нафты й газу. А на тым, што да ўлады прыйшлі прадстаўнікі рэваншу. І ня проста так прыйшлі — яны, выглядае, былі запатрабаваныя масамі.

Раскол у грамадзтве (аб гэтым пісаў Артур Тойнбі) праходзіць не паміж багатымі і беднымі, не паміж клясамі, як гэта даводзілі марксісты, а празь сем'і, праз сэрца і мазгі кожнага чалавека. І сумленная, думаючая частка грамадзтва, як гэта часьцей за ўсё здараецца ў гісторыі, засталася ў безнадзейнай меншыні. Нават людзі бездакорнай рэпутацыі, тонкага літаратурнага густу — прэзыдэнт Расейскага ПЭН-цэнтру Андрэй Бітаў і Фазіль Іскандэр, аўтар знакамітых аповесьцяў «Сандро з Чэгэму» і «Трусы й удавы» — ня вытрымалі, паставілі свае подпісы пад тэкстам антыамэрыканскай праклямацыі ў духу хрушчоўскага часу. Бітаў, праўда, свой подпіс адклікаў. Але агульнай карціны шчырай падтрымкі замежнай палітыкі Крамля гэта не зьмяніла. Нават у перадачах расейскай службы радыё «Свабода» з удзелам праваабаронцаў вы практычна не пачуеце галасоў тых, хто асуджае дзеяньні Расеі ў Грузіі. Агульнае меркаваньне: «у НАС не было іншага выйсьця». Сумняюцца ў гэтым пастуляце адзінкі. І гэта пры тым, што паводле дакумэнтальных сьведчаньняў назіральнікаў Human Rights Watch, у Цхінвалі падчас канфлікту былі разбураныя 5 адсоткаў будынкаў, а ў навакольных грузінскіх вёсках — да 50 адсоткаў і больш, прычым большасьць дамоў былі падпаленыя і разрабаваныя.

Што ж, дзьве тысячы гадоў таму натоўп, як мы ведаем, крычаў: «Распні яго»! Гэта пра тое, што большасьць заўсёды мае рацыю.

### Падвойная праўда

Размовы пра мараль сёньня здольныя выклікаць хіба толькі раздражненьне. Эпоха 60-х, і шасьцідзясятніцтва як такое, скончылася на на нашых вачах, з адыходам Быкава. У Беларусі засталіся некалькі мастадонтаў, якіх трэба было б узяць пад ахову дзяржавы. А іх, наадварот, улады цкуюць паводле старой памяці (дакладней, павінуючыся жывёльнаму інстынкту), не дазваляюць запрашаць у дзяржаўныя СМІ, нават згадваць у тытрах фільмаў пры паказе на БТ. Ім, «мастадонтам», падавалася, што трэба людзям гаварыць праўду, усю праўду і нічога акрамя праўды — і людзі вызваляцца, ачысьцяцца, стануць іншымі. «Жыць не ў ілжы» — заклікаў Салжаніцын, барукаючыся з камунізмам. Камунізму ня стала. Мана засталася.

Выявілася, што людзям не патрэбная ўся праўда. І нават каліўца яе не патрэбна, калі ім жывецца добра.

Альбо людзям так падаецца, бо іншага жыцьця яны ня ведалі й ведаць ня хочуць. І што азначае ўся праўда? Ці вядомая яна самім праўдалюбцам? Альбо нехта прапануе сябе ў ролі мэсіі? Дык у гэтай ролі зручней пачуваецца кіраўнікам дзяржаваў. Ім і веры больш — бо на іх баку моц.

Але самае кепскае палягае на тым, што пятнаццаць апошніх гадоў дэмапазыцыя несла слова Праўды (менавіта так, толькі зь вялікай літары), раскрываючы людзям вочы на ўладу і яе злоўжываньні, трымаючы яшчэ адну маленькую праўду — для сябе. Грантык, паездку за мяжу, магчымасьць уладкаваць сына ці дачку ў замежны інстытут па праграме Каліноўскага. Нічога асаблівага. Усе мы людзі, з сваім клопатам, асабістымі праблемамі, усім трэба карміцца. Хто сам без граху, хай першым кіне камень...

Толькі вось гэтая падвойная праўда — адна для сябе, другая для грамадзтва — яна непазьбежна вяла сваіх носьбітаў да раздвоенай сьвядомасьці, да свайго роду грамадзкай шызафрэніі. Вынікі яе мы сёньня маем шчасьце назіраць падчас сёлетняй выбарчай кампаніі. Сёньня — толькі байкот! Заўтра — удзел з мэтай тлумачэньня выбарцам бессэнсоўнасьці ўдзелу (!) у выбарах. Што будзе заўтра, ніхто нават ня хоча думаць. Тыя, хто патрапіць у палату, напэўна, стануць звысок глядзець на тых, хто туды не патрапіць. А тыя, хто не патрапіць, будуць байкатаваць тых, хто атрымае дэпутацкія «корачкі», абвінавачваць іх у здрадзе. У здрадзе чаму, якім ідэалам? У любым выпадку, новая сытуацыя пойдзе ў нейкім сэнсе на карысьць грамадзтву.

Калі ў парлямэнт патрапіць хоць частка дэмакратычных кандыдатаў, гэта паскорыць разлажэньне апазыцыі старога прызыву. Бясконцае корпаньне ў дробных унутрыпартыйных і міжасабовых праблемках ніяк не дае ёй узьняцца да асэнсаваньня агульнанацыянальных праблемаў на фоне глябальных зьменаў, падземнае гудзеньне якіх мы адчуваем ужо амаль фізычна.

А вось ці прыйдзе на месца старой апазыцыі новая — вялікае пытаньне.

### Крута быць тупым

Ня варта думаць, што моладзь заўсёды нясе з сабой нешта новае і перадавое толькі таму, што яна — моладзь.

Ня будзем засяроджвацца на тым, што адбылося з маладым пакаленьнем, якое вырасла за Лукашэнкам. Ёсьць глябальныя тэндэнцыі, якія закранулі і Беларусь.

Нядаўна ў Нямеччыне выйшла кніга Анны Вайс і Штэфан Бонэр пад назвай Generation Doof («Пакаленьне тупіцаў»).

«Паглядзіце розныя тэлешоў, пасядзіце ў інтэрнэце, прыглядзецеся да людзей на вуліцы — здаецца, што ўсе навокал сталі дурнаватымі». (Тут і далей цыт. паводле часопісу «Знание — сила», № 8, 2008, ст. 5—9.) «Можна дамагчыся посьпеху ў жыцьці, не навучаючыся нічому, не абцяжарваючы сябе ні розумам, ні ведамі, ні здольнасьцямі. Не чалавек — мера ўсіх рэчаў, і ня Бог, а Шчасьлівы Выпадак. Мы — усяго толькі рабы, прыкутыя да Кола Фартуны, і ня трэба парыцца, прыкладаць намаганьні на навучаньне ці нешта яшчэ — лепей адразу стаць мільянэрам». (Дадамо ад сябе — выйграць у Супэрлято.) Асноўная выснова кнігі Вайс і Бонэр: Dumb is the new cool! — Быць тупым цяпер крута!

У кнізе С'юзэн Джэйкабі «Эпоха амэрыканскай неразумнасьці» (The Age of American Unreason), якая выйшла ў сьвет летась, прыводзяцца такія зьвесткі. «Хто такі Адольф Гітлер? Нямецкі кайзэр? Гандляр зброяй? Прэмьер-міністар Аўстрыі? Райхсканцлер Нямеччыны? Амаль чвэрць маладых амэрыканцаў ня можа адказаць на гэтае пытаньне. Каля паловы амэрыканцаў не змаглі адказаць, калі ў іх краіне адбылася грамадзянская вайна, кожны чацьверты лічыў, што Калюмб адкрыў Амэрыку пасьля 1750 году». Прычым у ЗША цяпер працуюць 4200 вышэйшых навучальных установаў, у якіх вучацца 15,7 мільёнаў студэнтаў.

Гэтая Амэрыка, дарэчы, будзе выбіраць паміж Маккейнам і Абамам.

Зрэшты, веды школьнікаў у Расеі ці ў большасьці краінаў Эўропы (за выключэньнем Фінляндыі, дзе конкурс у пэдунівэрсытэты складае 10 чалавек на месца, бо прафэсія пэдагога лічыцца там самай прэстыжнай) не нашмат вышэйшы. Усё гэта вядзе ў дарослым жыцьці да ўсеагульнай прафанацыі — навукі, літаратуры, мастацтва, журналістыкі, палітыкі...

### Успамінаючы Шпэнглера

У савецкага кінарэжысёра Міхаіла Рома, акрамя славутай дакумэнтальнай стужкі «Звычайны фашызм», быў яшчэ адзін дакумэнтальны фільм, цяпер незаслужана забыты. Праўда, ён яго ня скончыў, і за яго працу над фільмам спрабаваў завершыць рэжысёр Грыгоры Чухрай, які назваў стужку «І ўсё-ткі я веру...» Найбольш каштоўную яе частку, на мой погляд, складае пачатак, які пасьпеў змантажаваць і агучыць сам аўтар. Ром, падсумоўваючы вынікі Першай сусьветнай вайны, у сваім закадравым тэксьце згадвае нямецкага філёзафа Освальда Шпэнглера, аўтара забароненай у Савецкім Саюзе кнігі «Захад Эўропы» (1918—1922 г.).

Шпэнглер прадказваў, што праз дваццаць гадоў пачнецца новая ўсясьветная вайна, бо за гэты час у Эўропе вырасьце новае пакаленьне, якое не зьведала жахаў вайны і якому абавязкова захочацца паваяваць. Філёзафу ня верылі. Ягоныя словы здаваліся анахранізмам. Потым наступіў 1939 год...

Калі я ўспамінаю фільм Рома, дзеля якога зьбягаў з урокаў у кінатэатр «Новости дня» і які нікога не цікавіць сёньня, бо даўно разабраны ягонымі калегамі на кінацытаты, дык адчуваю сябе шкаляром, які заблукаў у цемры часу.

Засталіся жывыя моманты — яркія, як фотаўспышка, — адбітыя ў шматлікіх кадрах: Праская вясна, моладзевы бунт у Парыжы, «Бітлз». Тыя кадры паступова зрабіліся свайго роду музэйнымі фотаэкспанатамі за пыльным шклом (я і сам сябе адчуваю такім экспанатам). «За шклом», між іншага, называўся супэрпапулярны раман Рабэра Мэрля, прысьвечаны падзеям у Парыжы 1968-га. Ці хто перачытвае цяпер той бэстсэлер?

А ў Расеі ўжо амаль вырасла новае пакаленьне, якое ні дня не жыло ў Савецкім Саюзе, але якому ўсе апошнія гады ўводзяць у вушы, што распад СССР быў найвялікшай геапалітычнай катастрофай XX стагодзьдзя. А старэйшае савецкае пакаленьне — у большасьці як тыя Бурбоны ў эпоху рэстаўрацыі, якія ні на што не забыліся і нічому не навучыліся.

Астатнім застаецца моўчкі назіраць за новым захадам Эўропы?

# Царыца Ізраілева



Новая прэм'ер Ізраілю ў маладосьці працавала сакрэтным агентам «Масаду». Яе называюць «супэржанчынай» і зьвязваюць зь ёю надзеі на абнаўленьне палітычнага сьвету краіны. А яшчэ яна дачка выхадца зь Беларусі.

Калісь Шымон Пэрэс, пасьля чарговых выбараў, дзе пацярпеў паразу насуперак бліскучым вынікам экзытполаў, у роспачы прамовіў: «Ізраіль — такая краіна, дзе людзі кажуць праўду на апытаньнях, а потым хлусяць на саміх выбарах». Пасьля нядаўніх праймэрыз у кіроўнай партыі «Кадыма» ізраільцяне могуць уздыхнуць спакойна: не, яны кажуць праўду як на апытаньнях, так і на выбарах. Альбо, калі хлусяць, дык робяць гэта шчыра — і там, і там. Так ці іначай, на пасадзе прэм’ер-міністра Ізраілю мае апынуцца жанчына, якой усе сацыялягічныя апытаньні ўжо даўно варажылі перамогу — Цыпі Ліўні.

## Сп-ня Супэржанчына

Выдае на тое, што ў Ізраілі нікога не бянтэжыць выведніцкае мінулае Цыпі Ліўні. Ліўні, якая, паводле Sunday Times, на пачатку 1980-х знаходзілася з спэцмісіяй у Парыжы, яшчэ падчас сваёй першай кампаніі стала абыгрываць на перадвыбарных слоганах сваю колішнюю належнасьць да «Масаду». У дзяржаве, дзе востра стаіць пытаньне замірэньня з краінамі-суседкамі, у аснову бяруцца праблемы бясьпекі, а прэм’ер часьцяком выконвае функцыі галоўнакамандуючага. І таму ў вачах грамадзтва масадаўскае рэзюмэ Ліўні — толькі перавага. Перавага хоць бы над яе папярэднікам Эгудам Ольмэртам, які ніколі не рабіў вайсковай ці выведніцкай кар’еры, а падчас тэрміновае службы быў карэспандэнтам армейскае газэты.

Трохгадовая служба Цыпі ў «Масадзе» — не адзіная перавага з цэлага шэрагу ейных станоўчых характарыстык, яшчэ адна грань яе шматграннае асобы. Яна — пасьпяховая адвакатка і кіраўніца ўпраўленьня дзяржаўных прадпрыемстваў. Выхадцам з былога СССР даспадобы яе колішняя пасада — міністаркі рэпатрыяцыі: такі чалавек павінны ведаць праблемы новых грамадзянаў зблізку.

У сувязі з адсутнасьцю дасье ізраільская прэса, ня надта перабіраючы мэтафары, параўноўвае Цыпі Ліўні з тэфлёнавым пакрыцьцём, да якога нічога ня ліпне. Дзіўным чынам любы недахоп Цыпі Ліўні як на ўзмах чароўнае палачкі ператвараецца ў дадатнасьць. Карупцыйны скандал зь яе шэфам і найбліжэйшым паплечнікам па партыі Эгудам Ольмэртам? Побач зь ім яна адно ўвасабленьне палітычнай чысьціні. Адсутнасьць досьведу ў прыняцьці стратэгічных пастановаў? Гэта спросьціць ёй шлях да новых, магчыма, вызначальных для лёсу краіны рашэньняў.

«Накінуць» новай кіраўнічцы Ізраілю можна хіба папулісцкія хаджэньні ў народ. З цэлай сьвітай рэпарцёраў яна снoўдалася паміж радамі тэль-авіўскага прадуктовага рынку, узважвала кавуны перад аб’ектывамі камэраў і імпэтна рукалася з расчуленымі гандлярамі. Але гэта хутчэй рытуальная завядзёнка, абавязковая цырымонія для кожнага ізраільскага палітыка буйнога калібру. У штодзённым жыцьці Цыпі — напраўду даволі дэмакратычны чалавек. Прычым зусім не для прэсы — сяды-тады нават позна ўвечары ходзіць па хлеб ці ў аптэку, а з абслугай — аўтар гэтых радкоў быў сьведкам — ветлівая, не пыхлівая.

А яшчэ яна жанчына, якая не хавае сваіх праўдзівых пачуцьцяў. У сьвядомасьці ізраільцянаў яна ўпершыню замацавалася трынаццаць гадоў таму, калі ў вечар пасьля выбараў, на якіх перамог яе тагачасны палітычны апанэнт Шымон Пэрэс, Ліўні, тады яшчэ палітык-пачатковец, шчыра расплакалася перад камэрамі.

Цыпі Ліўні — ні правая і ні левая, яскравы прыклад апалітычнага палітыка. Што злосьнікі маглі назваць «і нашым, і вашым», а прыяцелі нараклі абцякальна-прыязна — рэальная палітыка. Прыклад — стаўленьне Ліўні да пытаньняў рэлігіі. З аднаго боку, галасуе за дазвол лесьбійскім і гомасэксуальным парам усынаўляць дзетак, зь іншага — выступае супраць ініцыятывы сьвецкіх партыяў прадаваць звычайныя хлебныя вырабы на сьвята Пэсах (згодна з законамі юдаізму падчас гэтага сьвята дазваляецца спажываць выключна бяздражджавую мацу).

## Другая Голда Мэір?

Сапраўды, паміж гэтымі дзьвюма жанчынамі шмат супольнага. Падобна да першай ізраільскай абмасадаркі ў СССР, Голды Мэір, што прыклала шмат намаганьняў, каб у першыя, самыя цяжкія гады незалежнасьці ўгабрэйскай дзяржавы ўсталяваліся добрыя адносіны з магутнай імпэрыяй, Цыпі Ліўні на пасадзе міністаркі замежных справаў таксама ў нялёгкія для краіны часы, падчас ізраільска-лібанскага ўзброенага канфлікту 2006 г., зрабіла шмат дыпляматычных візытаў, каб заручыцца падтрымкай сусьветных лідэраў. Надзвычайная замежнапалітычная актыўнасьць Ліўні была заўважаная і сусьветнымі мэдыямі: у 2007 г. часопіс Time прылічыў яе да 20 найбольш уплывовых палітыкаў сьвету.

Як і Голда Мэір, Цыпі Ліўні шмат у чым кампрамісная фігура і сама прыхільніца палітычнай згоды і ўгоды.

У 2005 г. падчас ажыцьцяўленьня «Праграмы адасабленьня», калі Ізраіль зносіў габрэйскія паселішчы ў паласе Газы, Цыпі Ліўні ўзяла на сябе функцыі прымірыцелькі ў гарачых спрэчках паміж апанэнтамі і прыхільнікамі праграмы ва ўрадзе.

І характары ў дзьвюх жанчын падобныя — напоўніцу праяўляецца амбітнасьць і дабітнасьць. У Цыпі гэта, пэўна, спадчыннае.

Яе бацька, Эйтан Ліўні (Беназовіч), быў актывістам габрэйскай падпольнай арганізацыі. Ён нарадзіўся ў 1919 г. у Горадні і ва ўзросьце шасьці гадоў разам з сваімі бацькамі пераехаў з тэрыторыі Заходняй Беларусі, што тады была пад Польшчай, у зямлю Ізраілю, тады — частку Брытанскай імпэрыі. За сваю падпольную дзейнасьць Эйтан Ліўні ў 1946 г. быў прысуджаны брытанскай каляніяльнай паліцыяй да 16 гадоў зьняволеньня, але празь які год быў вызвалены падчас штурму турмы. Маці Цыпі, Сара, таксама актывістка габрэйскага руху, пакуль не ўцякла, адседзела паўтара году ў брытанскай турме ў Батлееме. Каб трапіць у турэмную больніцу, адкуль было прасьцей даць лататы, укалола сабе ў вену малако. Дарэчы, Эйтан і Сара былі першай парай, якая афіцыйна зарэгістравала свой шлюб пасьля заваяваньня Ізраілем незалежнасьці ў траўні 1948 г.

Дадамо шчэ, што бацькі далі дачцэ імя Цыпора, якое азначае «птушка» ў перакладзе з іўрыту. Зь цягам часу імя пасьпела састарэць (гэта ўсё адно што ў Беларусі мець імя Тэафіля ці Аграфена). Паводле другой вэрсіі, Цыпора зрабілася Цыпі з прычыны таго, што ў ізраільскай палітыцы вельмі важна быць «сваім хлопцам» (у нашым выпадку слушней сказаць «сваёй дзяўчынай»), а таму традыцыйныя габрэйскія імёны памяншаюцца да панібрацкіх скаротаў. Так колішнія прэм’еры Арыель Шарон і Бэньямін Нэтаньяху ніколі не супраціўляліся, калі аднапартыйцы і шараговыя грамадзяне называлі іх адпаведна Арык і Бібі. А Цыпі ажно крыўдуе, калі да яе зьвяртаюцца на старадаўні лад «Цыпора».

## Рэдкая птушка даляціць да сярэдзіны Ярдану

На фоне стабільнага эканамічнага становішча Ізраілю апошніх гадоў Ліўні атрымлівае ў спадчыну ад папярэдніка жмут неразьвязаных замежнапалітычных праблемаў, сярод якіх найбольш шчыміць палестынская. У сваім інтэрвію, якое Цыпі Ліўні дала пасьля праймэрыз арабскаму тэлеканалу «Аль-Арабія», яна заявіла, што ў ізраільска-арабскім пытаньні будзе рыхтаваць суайчыньнікаў да «балесных саступак».

Цяпер спадарыня Супэржанчына павінна даводзіць сваё вяршэнства штодзень у рэжыме он-лайн, апраўдваць неймаверна высокі крэдыт даверу. Бо дагэтуль Ліўні цешылася вельмі прыязным стаўленьнем з боку грамадзтва, відаць, з прычыны таго, што ізраільцяне пакуль што ня мелі магчымасьці бачыць яе на традыцыйна няўсядным у Ізраілі крэсьле прэм’ера.

**Павал Касьцюкевіч**

# Ці чакае ПАР лёс Савецкага Саюзу?

Не пасьпеў Аляксандар Лукашэнка запрасіць у госьці прэзыдэнта Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі Таба Мбэкі, як той нечакана перастаў быць кіраўніком дзяржавы. Што ж гэта азначае? Найперш перамогу віцэ-прэзыдэнта краіны Джэкаба Зумы.

Мбэкі неаднаразова спрабаваў пасадзіць яго ў турму па абвінавачаньні ў карупцыі, цяпер Зума аўтаматычна робіцца кандыдатам ад кіраўнічай партыі Афрыканскі нацыянальны кангрэс (АНК) на наступных выбарах. Аднак суперніцтва Мбэкі і Зума — гэта ня проста ўнутрыпартыйная барацьба двух лідэраў, за ім хаваецца адвечная для Афрыкі пляменная варожасьць. Мбэкі, як і Мандэла, прадстаўляе народ коса, Зума — ваяўнічых зулусаў. Суперніцтва зулусаў і коса мае даўнія традыцыі. У свой час АНК узначальваў зулус Альбэр Лутулі — першы афрыканец, які атрымаў Нобэлеўскаю прэмію міру. Калі ж на чале Кангрэсу стаў Мандэла, у кіраўніцтве сталі пераважаць коса. Зулусам гэта, натуральна, не спадабалася, і яны ўтварылі ўласную партыю Інкату, якая вяла барацьбу з Кангрэсам і фінансавалася паліцыяй Прэторыі. Зразумела, гэта не спрыяла сяброўству паміж коса і зулу, таму шмат хто з аналітыкаў лічыць, што вынікам вылучэньня Зумы можа стаць узмацненьне пляменнага сэпаратызму. Зулусы даўно мараць аб сваёй дзяржаве; басута, свазі, тсвана адчуваюць большую сувязь з супляменьнікамі ў суседніх краінах (адпаведна зь Лесота, Свазілэндам, Батсванай), чым з Тсванэ, як цяпер называецца Прэторыя. Не забылася і расавая нянавісьць. Большасьць чарнаскурых па-ранейшаму жывуць у галечы і зь нядобрай зайздрасьцю паглядаюць на багатых белых і азіятаў. Па колькасьці забойстваў на расавай глебе ПАР нават перасягае суседнюю Зымбабвэ.


Джэкаб Зума.
Таба Мбэкі.

Сярод белых асобную групу традыцыйна складаюць буры — нашчадкі галяндзкіх каляністаў XVII ст. Буры падкрэсьліваюць, што іх Радзіма — Афрыка, а не Эўропа. Яны складалі паноўную групу ў часы апартэіду, і ім асабліва цяжка зьмірыцца са стратай становішча «старэйшага брата». Буры мараць аб аднаўленьні сваёй дзяржавы, хоць бы ва ўсечаным выглядзе. Нельга не сказаць і аб такой групе насельніцтва, як мулаты, якія ўтварыліся ад сумесі эўрапейцаў з афрыканцамі. Белыя ня лічаць іх сваімі, а чорнымі яны самі сябе ня хочуць прызнаваць. У мулатаў ёсьць свой цэнтар — правінцыя Заходні Кейп. Ня выключана, што і яны захочуць сваёй рэспублікі.

Яшчэ ў 1994 г. некаторыя аналітыкі прадказвалі Паўднёвай Афрыцы «парад сувэрэнітэтаў». Маральны аўтарытэт Н.Мандэлы дазволіў захаваць адзінства краіны, але ні ў каго зь яго наступнікаў няма такога аўтарытэту. Ці ня пойдзе новы прэзыдэнт краіны, каб захаваць гэтае адзінства, зымбабвійскім шляхам дыктатуры і расавай нянавісьці? Такі сцэнар хвалюе сьвет, бо ПАР яшчэ ў 1980-я мела атамную бомбу. І хоць на пачатку 1990-х Паўднёвая Афрыка, як і Беларусь, адмовілася ад ядравага ўзбраеньня, у краіне застаецца ўсё патрэбнае, каб гэтае ўзбраеньне аднавіць.

P.S.: У адной з сваіх апошніх п’ес Бэрнард Шоў прадказаў зьяўленьне ў Афрыцы «чорнага Гітлера», які здолее набыць у белых людзей любую зброю. Гісторыя чорнага кантынэнту паказала, што вялікі ірляндзец не памыляўся.

**Вацлаў Шаблінскі**

# Быць ці ня быць — ото пытаньне

У Львове рамантуюць дарогі, праз гэта вакол заторы. Львоў рыхтуецца да «Эўра–2012». Але я прыехала не на футбол, а на кніжны кірмаш, які мае назву «Форум выдаўцоў» і праводзіцца сёлета 15-ы раз. Рэпартаж **Наталкі Бабінай**.

Яшчэ да пачатку Форуму журы ў складзе 80 чалавек на працягу дня мусіла выбраць найлепшыя ўкраінскія кнігі, выдадзеныя за год. Гэта была цяжкая задача, напрыклад, для мяне. З прадстаўленымі на конкурс 400 кнігамі мусіла азнаёміцца на працягу некалькіх гадзінаў... Па-мойму, мой выбар найлепшых украінскіх кніг выклікаў лёгкае зьдзіўленьне калег зь пісьменьніцкай групы журы. Яны выбіралі найлепшыя кнігі, арыентуючыся на якасьць ці грамадзянскую вартасьць тэкстаў, рэдактуры, паліграфіі, можа, — падсьвядома — на рэпутацыю выдавецтваў...

Маю ж увагу прыцягвалі найбольш кнігі, якія немагчыма ўявіць выдадзенымі цяпер па-беларуску ў Беларусі: «Электронны перанос у паўправадніках і паўправадніковых структурах», Чак Палагнюк «Байцоўскі клюб»...

Спрэчку на фінальным пасеўджаньні журы, калі рэйтынгавым адкрытым галасаваньнем трэба было выбраць найлепшыя з кніг, што набралі аднолькавую колькасьць галасоў, выклікаў «Нацыянальны атлас Украіны». «Нацыянальны атлас — гэта як герб і сьцяг!» — пераконвала я пісьменьніцу і вядоўцу тэлеканалу «1+1» Ларысу Дзенісенку. «Ды ня буду я за яго галасаваць! Я ж яго нават не падыму — ён таўшчэзны і фарматам паўмэтра на мэтар! Што за гігантаманія!» — абуралася яна. Бурныя спрэчкі... Дзіўна ўсё гэта мне, звыклай да беларускіх рэалій усеагульнага адабрамсу зьверху вызначанай лініі партыі...

А Гран-пры заваяваў «Гамлет». Шэкспір У., «Гамлет», пераклад на ўкраінскую Юр'я Андруховіча, з выдатнымі ілюстрацыямі Ўладзіслава Ярка, кіеўскага выдавецтва «А-ба-ба-га-ла-ма-га».

І гэта падалося паказальным. Украіна выбірае Гамлета па-ўкраінску.

Шуміць ды гудзе Львоўскі «Форум выдаўцоў». Мне цікава параўнаць яго з кніжнымі кірмашамі ў Менску, Маскве, Варшаве. У параўнаньні зь Менскімі міжнароднымі кірмашамі ён большы разоў у дзесяць і абсалютна іншы па якасьці.

Цікавасьць да яго з боку чытачоў вялізная. Ідуць і ідуць бясконцым патокам, і выходзяць з поўнымі пакетамі кніжак. Кніжкі амаль выключна па-ўкраінску. «Дык што, вы па-расейску нічога не выдаеце?» — цікаўлюся ў мэнэджара харкаўскага выдавецтва «Фактар». «Выдаем, але сюды стараемся не прывозіць», — сьмяецца ён. «Мы выдаем кнігі па-расейску, — удакладняе ўладальнік вельмі пасьпяховага кіеўскага выдавецтва «А-ба-ба-га-ла-ма-га» Іван Малковіч. — Але на кожнай такой кнізе, выдадзенай па-расейску і для расейскага рынку, пазначана: «Кніга ня можа прадавацца на тэрыторыі Ўкраіны».

Назіраю, як вядзе бізнэс-перамовы з выдаўцамі львоўская перакладчыца Бажэна Антаняк. За старонку перакладу дзіцячай кніжкі зь верхнялужыцкай ёй прапануюць 4—6 даляраў. Мусіць, дзесьці такія расцэнкі на пераклад і ў Менску. Толькі ў Менску не перакладаюць зь верхнялужыцкай на беларускую, а тое, што перакладаюць зь якой ангельскай на расейскую, будзе праілюстравана абсалютна інакш. «Мы стараемся адысьці ад расейскай традыцыі ілюстраваньня, намацаць сваё, арыгінальнае», — кажа Мар'яна Саўка, уласьніца львоўскага «Выдавецтва Старога Льва». І сапраўды, ілюстрацыі ўкраінскіх дзіцячых кніжак вельмі адметныя.



**Ва Ўкраіне выходзяць цудоўна ілюстраваныя дзіцячыя кнігі. Гэта малюнак Уладзіслава Ярка да «Казак Туманнага Альбіёну».**

Да слова, кнігі «ВСЛ» атрымалі на Форуме спэцыяльны прыз украінскага МУС.

Міністар унутраных справаў, выступаючы на адкрыцьці Форуму, давёў да ведама прысутных, што Міністэрства закупіць кніг на нейкую астранамічную суму для таго, каб іх чыталі міліцыянты і падвышалі свой культурны ўзровень...

У мяне няма словаў для камэнтару, а вось тэлежурналісты (а ва Ўкраіне каля 50 тэлеканалаў) у гэты ж вечар цікавіліся на вуліцах у міліцыянтаў, што тыя чытаюць цяпер і рабілі пра гэта рэпартажы.

Спрэс праходзяць аўтографсэсіі пісьменьнікаў. Ажыўлена праходзяць. Але найбольшая чарга ля стэнду львоўскага выдавецтва «Піраміда», дзе падпісвае кнігі Марыя Мацёс. Пані Марыя — каралева ўкраінскай літаратуры. Смуглявая і чарнавокая, бездакорная прычоска, палевы касьцюм туга аблівае паставу, манеры каралевы.

Вялізныя бігборды з рэклямай новай кнігі Мацёс «Маскаліца», выдадзенай накладам 25 000 асобнікаў, стаяць па ўсім Львове.

«На ўкраінскім рынку дзьве пісьменьніцы атрымліваюць незвычайна вялікія аўтарскія ганарары, — гаворыць львоўскі прафэсар Анатоль Іўчанка. — Гэта Джаан Роўлінг — 28% роялці і Марыя Мацёс — 20%». Гэта ўражвае, калі ўлічыць, што звычайны аўтарскі ганарар — 6—8%.

Я на Форуме таксама маю дзьве, як тут кажуць, «акцыі». Сустрэча з чытачамі на стэндзе выдавецтва «Зялёны пёс», дзе неўзабаве мае выйсьці мой раман «Рыбін горад», і парныя чытаньні з Ларысай Дзенісенкай у тэатры «Ўваскрасеньне». На свае «акцыі» я не паленавалася прыперці цэлую торбу выданьняў з сэрыі «Кнігарня «Наша Ніва». Шчыра кажучы, была гатовая да таго, што прыйдзецца іх перці назад у Менск. Але амаль усё разышлося. Першымі разабралі «Лісты зь лесу» Севярынца. Ва Ўкраіне цікавяцца Беларусьсю, а інфармацыі пра нас тут няма амаль ніякай.

«Магчыма, гэта такая маркетынгавая пазыцыя ўласьнікаў інфармацыйных сродкаў, — гаворыць Рыгор Гусэйнаў, галоўны рэдактар аўтарытэтнага, хоць і не сталічнага літаратурнага часопісу «Кур'ер Крыўбасу». — Расея прысутнічае на нашым інфармацыйным полі найперш сваімі тэлеканаламі. А паколькі Беларусь успрымаецца нейкім ценем Расеі, то нашы СМІ ўвагі ёй не надаюць. Прыбалтыка, краіны Эўропы — гэта цікава шараговаму ўкраінцу, а Беларусь — не».

Спадар Гусэйнаў — ляўрэат найбольш прэстыжнай украінскай прэміі імя Шаўчэнкі. І ён адзіны зь ляўрэатаў, хто не скарыстаў прэмію на свае патрэбы, а паклаў на спэцыяльны рахунак, і з працэнтаў штогод, у сваю чаргу, дае прэмію 15 000 грыўняў (гэта каля 3000 даляраў) таму ўкраінскаму пісьменьніку, якога лічыць найбольш вартым падтрымкі. «Ну што, выдаткаваў бы я гэтыя грошы на свае патрэбы, купіў бы сабе там новы аўтамабіль, ці што, але навошта мне гэта? Мне не бракуе на жыцьцё, — сьмяецца спадар Рыгор і дадае: — Цяпер украінская літаратура знаходзіцца на спадзе. Але гэта натуральны працэс. Пасьля спаду неадменна будзе пад'ём. Магчыма, і мая прэмія паспрыяе гэтаму — хоць трошкі».

Мяркуючы па ўсім, за будучыню ўкраінскай літаратуры моцна хваляваца не варта. А за нас крыўдна. Бо ў нацыянальнай літаратуры, нацыянальным кнігавыданьні, падалося, адсталі мы ад Украіны на нямераную колькасьць парсекаў...

Украінцам ужо ня трэба самім сабе даказваць, што могуць чытаць Гамлета і Пушкіна ды глядзець фільмы па-ўкраінску. Па-ўкраінску выдаваць падручнікі па электроніцы. Што ўкраінская пісьменьніца можа быць цікавай ня менш за ангельскую.

Але мы таксама гэта хутка дакажам, праўда?

*Львоў—Менск*

## НОВЫЯ КНІГІ ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

### Новая літаратурная зброя

**Жыць ня страшна. Фрэскі. Барыс Пятровіч. Менск: Медисонт. 2008—255 с. 500 ас.**

Для Барыса Пятровіча крызіс сярэдняга ўзросту пісьменьніка, які пачынаў свой творчы шлях яшчэ за савецкім часам, пасьпяхова пераадолены. Плён гэтага перамогі — кніга «Фрэскі».

Паводле словаў крытыка Данілы Жукоўскага, у сваіх караценькіх творах аўтар мае любасьць да канкрэтных літаратурных «штучак». Тут і мініятуры-жахалкі, і вершы ў прозе, і вымысленыя інтэрвію, і іншыя сакаўныя «малечы». Узьвівы фантазіі з абмежаванай колькасьцю словаў і трыюмф нечаканага фіналу ў постмадэрнісцкім ключы.

«Фрэскі» — пасьпяховае выпрабаваньне літаратурнай зброі, а таксама выпрабаваньне межаў беларускай літаратуры, выпрабаваньне, якое часам нагадвае разгойдваньне. Гэтая напорыстая разнастайнасьць, безумоўна, робіць «Фрэскі» разам з кнігамі Клінава і Вежнавец, літаратурнай падзеяй 2008 году.

### Нататкі разумнага паляка і разумнага расейца

**Вильна 1824-1825: Перекрёстки памяти. Сост. Федута А.И. — Минск: «Лимарус», 2008. — 244 с. 400 экз.**

Гэта амаль дэтэктыўныя ўспаміны пра самую гучную палітычную справу на былых землях Рэчы Паспалітай у першай траціне XIX ст. — справу філяматаў і філярэтаў. Высокапастаўлены расейскі службовец Навасільцаў вядзе сьледзтва аб сакрэтных таварыствах, вынікам якога стане закрыцьцё Віленскага ўнівэрсытэту — найстарэйшай на тэрыторыі Расейскай Імпэрыі навучальнай установы.

Першыя ўспаміны — польскі, а хутчэй рэчпаспаліцкі погляд — належаць гісторыку і палітычнаму дзеячу Яўхіму Лялевелю. Другія — расейскае гледзішча. Аўтар — Іван Лабойка, прафэсар расейскай мовы і літаратуры.

Маладыя Міцкевіч, Чачот, Зан, Дамейка — зблізку...

Паліткарэктную, як сама кніга, прадмову напісаў Аляксандар Фядута.

### А хто там і дзе?

**История имперских отношений: беларусы и русские. 1772—1791 гг. Сост. Тарас А.Е. — Смоленск: Книжный клуб «Посох», 2008. — 608 ст. 150 экз.**

Гэта трэці публіцыстычны паход на Маскву. Першыя два — «Письмо к русскому другу» Каўкі і «Русская книга» Дубаўца да мэты не дайшлі — былі спажытыя на месцы беларускімі элітамі. Спадзяемся, гэтым разам дапне.

Мэта ўсіх такіх паходаў — папулярна, русским языком, растлумачыць інтэлектуалу з сумежнай краіны, што такое Беларусь, хто такія беларусы, адным словам, адказаць на пытаньне ўсходніх суседзяў «А хто там і дзе?» Для нашага ж чытача — добра вядомыя выкладкі добра вядомых аўтараў.

Зь недахопаў — трошачкі бянтэжыць тэндэнцыйнасьць высновы, якая ня надта стасуецца з асноўнымі тэкстамі. Варта быць панавуковей — Масква сьлязам ня верыць.

**Павал Касьцюкевіч**

# Зь юбілеем, Белаазёрск!

Горад на Берасьцейшчыне, што дае ладнай частцы беларусаў сьвятло ў дом ды абувае іх у красоўкі зь лягатыпам у выглядзе кашэчай лапы, адзначыў 50-годзьдзе.

Маладыя гарады, што нібы зь нічога ўзьніклі ў савецкі час у якасьці непазьбежнага дадатку да якога-небудзь чарговага прамысловага гіганту, часам тояць у сабе сюрпрызы. Як Жодзіна, які, дзякуючы дапытлівасьці мясцовых краязнаўцаў, пасталеў больш як на тры стагодзьдзі, ці маладыя Навалукамля і Наваполацак, што дадалі ў сваіх назвах да прыстаўкі Нава- імёны сваіх сівых суседзяў. У дзясятак разоў маладзейшы за суседнюю Бярозу Белаазёрск — тое яшчэ места.

## «Адкуль вы, дзетачкі, з Грэсі?»

Трохі гісторыі. Белаазёрск, як і шмат якія падобныя паселішчы, пачынаўся з пабудовы працоўнага пасёлку. Першыя баракі ўзьніклі на краі вёскі Ніўкі ў 1958 г. Пра горад яшчэ ніхто не гаварыў і ГРЭС, якую злучылі зь Белым возерам сыстэмай каналаў, назвалі Бярозаўскай — у гонар бліжэйшага да яе раённага цэнтру Бярозы. Праз два гады пасёлак спачатку назвалі Бярозаўскім, а пасьля ахрысьцілі нарэшце Белаазёрскам. Гарадзкі статус ён набыў у 1970 г. Але шмат хто з старых жыхароў навакольных вёсак дагэтуль ня звыкнецца з такім суседзтвам. Так і пытаюць у дзяцей, што шыбуюць да аднаго з азёраў: «Адкуль вы, дзетачкі, з Грэсі?».

На сёньня жыхарства Белаазёрску набліжаецца да трынаццаці з паловай тысячаў чалавек. Акрамя ГРЭС, што дае ладнай частцы беларусаў сьвятло ў дом, тут працуе энэргамэханічны завод, запчасткі якога набываюць ня толькі нашыя суседзі, але й далёкія Куба з Іракам. Беларуска-гішпанскае прадпрыемства «Белкельме» абувае аматараў спартовага абутку ў красоўкі зь лягатыпам у выглядзе кашэчай лапы. Ёсьць тут чыгуначная станцыя з навюткім вакзалам. Ды працы ў невялікім горадзе ўсім не хапае, таму найбольш актыўныя знайшлі яе ў Бярозе, а хто-ніхто і ў Менску. Мясцовыя дзеткі наведваюць дзьве школы і гімназію, малеча — шэсьць садкоў, частка выпускнікоў — мясцовы каледж. Перад маладымі бацькамі стаіць ня толькі пытаньне працаўладкаваньня, але й жыльля, бо ў Белаазёрску новыя дамы амаль не будуюцца. Нярэдкая зьява — арэнда кватэраў і пакояў. Кватэры каштуюць амаль як у абласным Берасьці, і набываюцца вельмі хутка — як толькі пайшла пагалоска.


Наймаладзейшая ў Беларусі гісторыка-культурная каштоўнасьць – 1994 г.н.


Брама Пескаўскага палацу.

## Ахоўваецца гісторыяй

Нягледзячы на адносную маладосьць, горад энэргетыкаў мае сваю гісторыка-культурную каштоўнасьць. Пра гэта сьведчыць шыльда на мясцовай праваслаўнай царкве, закладзенай у 1994 г. у гонар сьв. Серафіма Сароўскага. У сваёй прыгажосьці храм спаборнічае зь пяцідзясятніцкай царквой Сьв.Тройцы, што разьмясьцілася трохі ў баку ад таго самага месца, зь якога пачынаўся некалі горад. Побач з пратэстанцкім храмам сярод акуратна пастрыжаных кустоў бруяцца фантаны, браму ўпрыгожваюць анёлы. Праваслаўныя не адстаюць — перад царквой зрабілі стаянку, на ходніках кладуць новую плітку. Але гэта ўсё немаўляты ў параўнаньні з тым, што можна пабачыць у наваколлі Белаазёрску, а менавіта ў суседняй вёсцы Пескі, дзе захаваліся рэшткі сядзібы і парку славутага роду Пуслоўскіх. Сядзіба тая вядомая з XVI ст. Да пажару 1843 г. тут быў палац, у якім захоўвалася багатая калекцыя жывапісу. У XVIII ст. побач з палацам разьбілі цудоўны парк, у ім выкапалі сажалкі, якія напаўняліся водамі Чорнага возера праз адмысловую сыстэму каналаў. Пасьля пажару пад жылое памяшканьне перабудавалі стайню. Гэты будынак з чатырма калёнамі захаваўся да нашых дзён, як і парк, сьпіртзавод, каравульнае памяшканьне і дзьве брамы.

## Вось каб жа...

Сядзібна-паркавы комплекс, як сьведчыць шыльда, ахоўваецца дзяржавай, аднак заходняя вежа як стаяла паўразбураная насупраць калгаснай фэрмы, так і стаіць. Былых магнатаў даўно няма, але да парку ўжо падбіраюцца харомы новых гаспадароў жыцьця. Сярод старых дрэваў любяць папіць гарэлкі маладыя людзі з гораду. У былой стайні-сядзібе месьціцца турбаза, над якой навісае надбудаванымі паверхамі сьпіртзавод. Думаецца, што карысьці з таго, што ацалела, можна было б атрымліваць нашмат болей, чым ад пескаўскай гарэлкі ды паслугаў лядашчай турбазы. Сажалкі так і просяцца, каб іх пачысьцілі і засялілі рыбай. Парк дагэтуль ня страціў былых рысаў і прыгажосьці. Азёры, што Чорнае, што Белае, нават у самы гарачы сэзон ня ведаюць і блізка той колькасьці наведнікаў, як шмат меншая Сьвіцязь. У самым Белаазёрску, побач з праваслаўнай царквой стаіць аздараўленчы цэнтар «Берасьцеэнэрга». Выглядае як ня горшы гатэль, ці прэстыжны курортны санаторый. У нешта падобнае ператварыўся былы пансіянат на той жа Сьвіцязі, то няблага было б і на тутэйшых азёрах нешта прыдумаць, бо інфраструктура адпачынку тут амаль адсутнічае. А прыклады, як можна зрабіць, ёсьць. На высьпе аднаго з азёраў у Бярозаўскім раёне прадпрымальнік збудаваў хатку і цяпер за грошы здае яе турыстам.

## На Саладуху за 25 тысячаў

Канцэрты прывазных зорак у мясцовым ДК — падзея рэдкая. Таму квіткі на якога Саладуху разыходзяцца ў момант, ня гледзячы на амаль менскія цэны. Вясной прыяжджаў Фінберг з аркестрам — вольных месцаў было вобмаль. Тое самае і ў Капылі, і ў Шаркаўшчыне. Неяк казаў пра тое Зьмітру Вайцюшкевічу. Хтохто, а ўжо ён зачараваў бы мясцовых паляшчук выкананьнем «Зялёнага дубочка». Мясцовая эстрада прадстаўленая ансамблем танцу «Журавінка» і студыяй эстраднай песьні «БЭЗ» (ня блытаць з расьлінай — гэта ўсё той жа энэргамеханічны завод). Ёсьць тут і альтэрнатыўная сцэна і нават незалежны лэйбл «Экстрэмальная музыка». Адзін з тутэйшых сайтаў мае рубрыку «Літаратура ў горадзе», але інфармацыі на старонцы небагата — партрэты мясцовых паэта і празаіка. Дзіўна, але пра цудоўную паэтку Ніну Мацяш тут ні слоўца.

## Палёт малой авіяцыі і кол. худ. самадзейнасьць

Яшчэ колькі гадоў таму некаторыя вуліцы Белаазёрску нагадвалі паваенную забудову Навагрудку ці Карэлічаў. Двух-, трохпавярховыя дамкі з пакатымі стрэхамі, выкладзеныя жаўтаватай вузкай цэглай. Цяпер сьцены тых дамоў хаваюцца пад тоўшчай тэрмафутра, разам з цэглай вельмі хутка зьнікаюць пісягі смалы, якой залівалі штогод прарэхі ў страсе і нацыянальныя надпісы. Мясцовы гатэль страціў камуністычную спадчыну ў выглядзе надпісу «50 год савецкай уладзе» і набыў новы гонтавы дах. На ходніках асфальт саступіў месца плітцы, зазелянелі газоны. Перад самым сьвяткаваньнем, калі ўсчаліся дажджы, пачалі фарбаваць прыпынкі і платы. Горад усё лета рыхтаваўся да юбілею. Чакалі высокае начальства з вобласьці. З афішаў, намаляваных ад рукі, стала вядома, што ў сьвяточнай праграме будуць сюрпрызы: акрамя звыклых выязнога гандлю і выступаў «кол. худ. самодеятельности», заплянавалі і палёты малой авіяцыі.

Зь юбілеем, Горад Белага Возера!

**Сямён Печанко, фота аўтара**



Тая самая ГРЭС, што горад корміць.



СЯРГЕЙ ШЫЛА, «НН»

# Бульба. Зараджай мазгі

**Арт-Бульба. Выставачны праект мастацкай галерэі «Ўнівэрсытэт культуры». Кастрычніцкая пл. 1 (Палац Рэспублікі)**

«Бульба» — небеларускае слова. Вытокі яго хаваюцца ў старажытнагрэцкай, дзе слова «больбос» абазначала цыбулю.

Пазьней, У Талмудзе «бульбусам» габрэі таксама назавуць цыбулю, праўда, адзін яе вельмі спэцыфічны гатунак. У часы Асьветніцтва ж, «бульбус» у шмат якіх эўрапейскіх мовах абазначаў проста «тоўстае карэньне». Слова на працягу стагодзьдзяў то ўсплывала ў розных лексычных значэньнях, ня маючы сілаў прычапіцца ні да аднаго прадмету, ці нават зьнікала на каторы час, покуль са спакойнай душой не прыжылося на глебе беларускай мовы.

2210 год. Вялізная Беларуская энцыкляпэдыя. «Хрыстафор Калюмб, (1451—1506) — гішпанскі бізнэсовец, першы экспарцёр бульбы».

Па прыбыцьці ў Эўропу амэрыканская гародніна ўсімі сваімі каранямі пачала прырастаць да мясцовых моваў. Старалася падлашчыцца да іншых, больш знаных пладоў, і гэтак, хаця б бачком прычапіцца да іх старажытных культурных радаводаў. Часам ёй гэта ўдавалася. Напрыклад па-француску «бульба» будзе pomme de terre, даслоўна — «земляны яблык».

Беларуская версія першароднага грэху: «З-пад бярозавай калоды вылазіць Зьмей-Спакушальнік і кажа: «Еўка, слухай, тут такое дзела, будзь чалавекам — хапані забароненую бульбу!»

Мастацтва нямала зрабіла для папулярызацыі бульбы. Адразу неяк прыходзяць на думку «Паядаючы бульбу» Ван Гога. Але выставачны праект, што адбываецца гэтымі днямі ў менскай галерэі «Ўнівэрсытэт Культуры», даказвае, што сёньня хутчэй яна, караняплод і легенда, робіць рэкляму ўсім мастакам-удзельнікам, даючы амаль гатовыя тэмы для працаў і ўжо фактам свайго зьяўленьня на палотнах і ў скульптурах прыцягвае ўвагу публікі. Тут не ідзе гаворкі пра стварэньне міфу пры пасяродку мастацтва, на «Арт-Бульбе» мастакі хутчэй летапішуць гэты міф, пашыраючы нашыя ўяўленьні пра яго. У творах выяўлена тое, што даўно прасілася навонкі. Напрыклад, праца Андрэя Хацяноўскага «Залаты запас Беларусі» — фігуральна зразуметая канцэпцыя бульбы як беларускага золата. На выставе заўважныя таксама спробы зазірнуць на адваротны бок міфу. І таму ж, пэўна, сярод працаў знайшлося месца калярадскаму жуку, гэткаму альтэр-эга бульбы.

Шмат хто з аўтараў сьвядома працуе з вобразам бульбы як з гатовым культурнымі клішэ. Напрыклад, абгарнуўшы бульбу ў прывабную абгортку шакаляднага батончыка, зараджаць мазгі заклікае Андрэй Валавік у сваёй працы «Nuts па-беларуску».

Хоць міф пра Маці-Бульбу ўжо даўно створаны, але гэтую выставу рука не падымецца назваць «спэкуляцыя на тэме» — па шчырасьці, ня так многа ўжо зроблена ў мастацтве на бульбяным фронце, і пакуль сказаць ёсьць што.

**Павал Касьцюкевіч**

**P.S.** Прыходзіць неяк Гогаль да Тараса Бульбы і кажа яму: «Я цябе нарадзіў, я цябе і зьем».

## ІМПРЭЗЫ

### Сустрэча з Алесем Разанавым і Ільмай Ракузэ

**26 верасьня ў бібліятэцы Інстытуту імя Гётэ ў Менску Фрунзэ, 5)** пройдзе літаратурная імпрэза «Культуры сустракаюцца ў слове». У ёй возьмуць удзел паэт Алесь Разанаў і Ільма Ракузэ — швайцарская пісьменьніца, прафэсарка славістыкі Цюрыскага ўнівэрсытэту. **Пачатак імпрэзы а 19.00.** Уваход вольны. Даведкі: (017) 294-04-91, bibl@minsk.goethe.org.

### Прэзэнтацыя ідыш-беларускага слоўніка ў Менску

**26 верасьня на Сядзібе ТБМ (Румянцава, 13) у 18.00** адбудзецца прэзэнтацыя ідыш-беларускага слоўніка Алеся Астравуха.

## ВЫСТАВЫ

### Беларускія мастакі ў Беластоку

**Да 12 кастрычніка ў беластоцкай галерэі «Арсэнал»** ідзе першарадная выстава твораў беларускіх мастакоў. Яе куратары — Тацяна Бембель, Артур Клінаў і Лена Прэнц — выбралі для паказу творы Вольгі Сазыкінай, Уладзімера Цэсьлера, Сяргея Ждановіча, Аляксея Фёдарава. Ігара Саўчанкі, Яні Грак. Аляксандра Камарова і групы Revision (Андрэя Дурэйкі, Андрэя Камарова, Максіма Тымінкі і Максіма Вакульчыка). Прэзэнтаваныя таксама творы Івана Базака і Аксаны Гурыновіч.

### Жывапіс пад жывы рок

**З 26 да 28 верасьня фальварак «Добрыя мыслі» (Магілёўская, 12)** запрашае на выставу сучаснага жывапісу пад жывы рок. Творы мастакоў наведвальнікі фальварку могуць глядзець пад гукі **«Джамбібуму»**, **«Плыні»**, **«Пленэру»** і інш. **Пачатак у 19.00.** Квіткі: 5000 рублёў.

### Восеньскі фэст

**Музэй народнай архітэктуры і побыту «Строчыцы»** запрашае **27 верасьня** на «Восеньскі фэст», дзе кожны можа ўзяць удзел у майстар-клясе па вырабе лялькі і пляценьні з саломы. Таксама можна будзе ўбачыць старадаўні абрад «Жаніцьба лучніка». **Пачатак у 13.00.**

### Вокны Менску. Адлюстраваньне

**Да 22 кастрычніка ў Мастацкім музэі** працуе выстава фотамастака Георгія Ліхтаровіча «Вокны Менску. Адлюстраваньне».

### Па мясьцінах Адама Міцкевіча

**У Музэі гісторыі беларускай літаратуры (Багдановіча, 15) да 18 кастрычніка** працуе фотавыстава «Па мясьцінах Адама Міцкевіча».

### Сьвята чытаньня — 2008

**З 8 да 11 кастрычніка ў Менску і Маладэчна** — Сьвята Чытаньня з удзелам пісьменьніцы Ан-Мары Поль.

### Сьвята польскай мовы з Шалкевічам

**26 верасьня на філялягічным факультэце БДУ (Маркса, 31, аўд. 63)** — «Сьвята польскай мовы». У праграме: тэатралізаваны пэрформанс, выкананьне песень, выступ польскамоўнага мараканца, конкурсы і падарункі. Вядоўца праграмы — Віктар Шалкевіч. Уваход вольны.

### «Ждановічы — Wonderland»

**З 27 верасьня да 10 кастрычніка ў фотагалерэі «Zнята» (кінатэатар «Цэнтральны», пр.Незалежнасьці, 13)** працуе фотавыстава Артура Вакарава. **Адкрыцьцё 27 верасьня у 17.00.**

## КІНО

### Грузінскія шэдэўры ў кінатэатры «Ракета»

**Да 20 кастрычніка** менскі кінатэатар «Ракета» паказвае грузінскія шэдэўры ў праграме «Фаварыты кіно».

Грузінскае кіно — бяспрэчны дыямэнт у сусьветным мастацтве. Ізноў убачыць яго могуць беларускія гледачы.

Фільм **«Каята»** (1984) Тэнгіза Абуладзэ многія гледачы памятаюць. З прэм'еры гэтай антытаталітарнай карціны і пачалася перабудова. Карцінамі **«Пастараль»** 1975 году й **«Фаварыты поўні»** 1984 будзе прадстаўлена творчасьць Атара Іяселіяні.

А стужкай Георгія Данэліі **«Не сумуй»** 1969 году — праграма завершыцца.

Расклад паказаў:

**29 верасьня** — «Каята»
**6 кастрычніка** — «Пастараль»
**13 кастрычніка** — «Фаварыты поўні»
**20 кастрычніка** — «Не сумуй»
**Пачатак кінапаказаў а 19.00.**
Тэлефон для даведак: 298-25-00.

**Адрас кінатэатру: Працоўны завулак, 3.**

**Андрэй Расінскі**

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Сукіякі вэстэрн Джанга

**Сукіякі вэстэрн Джанга** (Sukiyaki Western Django)

Японія, 2007, каляровы, 121 хв.

**Рэжысёр:** Такашы Міікe

**Ролі выконваюць:** Хідэакі Іта, Масанобу Анда, Каіці Сата, Квэнтын Тарантына

**Жанр:** Постмадэрновы самурайскі вэстэрн

**Адзнака:** 5,5 (з 10)

У мястэчку, дзе знайшлі золата, змагаюцца за ўладу банда Гэндзі, апранутая ў белае — і банда Хэйкэ, апранутая ў чырвонае. Калі ў вёсцы зьяўляецца каўбой, які надзвычай трапна страляе, паўстае пытаньне, а да каго ён далучыцца…

Карціна японскага рэжысёра Такашы Міікe, які выпускае дзёрзкія фільмы стаханаўскімі тэмпамі — глючнае сынэфільскае практыкаваньне ў вэстэрне, натхнёнае Квэнтынам Тарантынам, які зьняўся ў ролі апавядальніка.

Каўбоі — за выняткам Таранціны — японцы з кольтамі і катанамі, заклапочаныя цырымоніямі і новаю тэхнікай (кулямёты, выбухоўка — усё ідзе ў ход). Гэта вэстэрн, што зацята цытуе італьянскія стужкі 1960-х, самурайскія карціны Курасавы, мангу й анімэ, Шэкспіра і «Ноч жывых мерцьвякоў».

Міікe ня грэбуе анічым. Фільм пульсуе гвалтам, героі не хаваюць сваёй умоўнасьці і ганарацца благой гульнёй. Лёгіка стужкі — не сюжэт, і нават ня жанр — а цытаты зь фільмаў і жанраў, візуальная раскоша ліхаманкавага каляжу, белае і чырвонае, ружы, куля, адкінутая лязом.

Старая з кольтам, кулямёт у дамавіне (прывітаньне Міколку-Паравозу!), скрыня з золатам — рэжысёр падпарадкоўвае ўсё кропкавым візуальным ударам, і пляваць ён хацеў на агульны сюжэт.

Неахайна-выбуховы постмадэрновы каляж Міікe і Тарантыны можа лічыцца аднолькава бяздарным і аднолькава геніяльным.

**Андрэй Расінскі**

## КАНЦЭРТЫ

### Міжнародны дзень музыкі

**1 кастрычніка ў Філярмоніі у 19.00** пачнецца канцэрт дзяржаўнага аркестра Рэспублікі Беларусь пад кіраўніцтвам французскага рэжысёра Фаб'ен Тэерыксэна. Прагучаць творы Дэбюсі, Дзюка. Квіткі: 5000—12 000.

## ТЭАТРЫ

### Купалаўскі тэатар

**26 (пт)** — «Вольга»
**27 (сб)** — «Макбет»
**28 (ндз)** — «Дзіўная місіс Сэвідж»
**29, 1 (пн, ср)** — «Сны аб Беларусі»
**2 (чц)** — «Слуга двух гаспадароў»

*ранішія спэктаклі*

**28 (ндз)** — «Афрыка»

*малая сцэна*

**3 (пт)** — «Апэльсінавае віно»
**4 (сб)** — «Варшаўская мэлёдыя»

# Міжнародны фэстываль тэатраў лялек

У Менску **з 3 да 8 кастрычніка** пройдзе V Беларускі міжнародны фэстываль тэатраў лялек, падчас якога можна будзе ўбачыць больш за 20 спэктакляў з розных краінаў сьвету — Бэльгіі, Вялікай Брытаніі, Нямеччыны, Літвы, Польшчы, Расеі, Славеніі, Украіны, Чэхіі. Свае спэктаклі прапануюць і беларускія тэатры.

### 3 кастрычніка

*На сцэне Тэатру лялек (Энгельса, 20)*

**«Баляда пра белую вішню»** (Беларускі тэатар лялек). **Пачатак а 14-й.**

*На малой сцэне Тэатру юнага гледача (Энгельса, 26)*

**«Мора»** (тэатральная акадэмія, Клайпэда, Літва). **Пачатак а 17-й.**

*На сцэне Рускага тэатру (Валадарскага, 5)*

**«Запаветнае»** (трупа Ірыс Мэйнхардт, Штутгарт, Нямеччына). **Пачатак а 19-й.**

*На сцэне Купалаўскага тэатру (Энгельса, 7)*

**«Фаўст у кубе»** (рускі інжэнэрны тэатар «Ахе», Расея). **Пачатак а 21-й.**

### 4 кастрычніка

*На сцэне Тэатру лялек*

**«Чорная курыца, альбо Падземныя жыхары»** (тэатар «Лялька», Віцебск). **Пачатак а 11-й, 14-й.**

*На малой сцэне Тэатру юнага гледача*

**«Мора»** (тэатральная акадэмія, Клайпэда, Літва). **Пачатак а 17-й.**

*На сцэне Купалаўскага тэатру*

**«Крыжакі»** (тэатар Агара, Сэнт-Віт, Бэльгія). **Пачатак а 19-й.**

*На сцэне Тэатру лялек*

**«Памінальная малітва»** (Гомельскі тэатар лялек). **Пачатак а 21-й.**

### 5 кастрычніка

*На сцэне тэатру лялек*

**«Голы кароль»** (Менскі абласны тэатар лялек «Батлейка»). **Пачатак а 11-й, 14-й.**

*На малой сцэне Тэатру юнага гледача*

**«Самая маленькая жанчына ў сьвеце»** (тэатар Крэпска, Прага, Чэхія). **Пачатак а 17-й.**

*На сцэне Купалаўскага тэатру*

**«Мадэль»** (тэатар Рота, Гастынгс, Ангельшчына). **Пачатак а 19-й.**

*На сцэне Тэатру лялек*

**«Пэр Гюнт»** (Кемераўскі тэатар лялек імя А.Гайдара, Расея). **Пачатак а 21-й.**

### 6 кастрычніка

*На сцэне Тэатру лялек*

**«Осьлік з Назарэту»** (міні тэатар, Любляна, Славенія). **Пачатак а 11-й, 14-й.**

*На малой сцэне Тэатру юнага гледача*

**«Крохкі»** (тэатар Крэпска, Прага, Чэхія). **Пачатак а 17-й.**

*На сцэне Тэатру лялек*

**«Паляваньне на зубра»** (Берасьцейскі тэатар лялек). **Пачатак а 19-й.**

### 7 кастрычніка

*На сцэне Тэатру лялек*

**«Эгле — каралева вужоў»** (тэатар «Леле», Вільня, Літва). **Пачатак а 14-й.**

**«Паэма бяз словаў»** (Гарадзенскі абласны тэатар лялек). **Пачатак а 19-й.**

*На сцэне Купалаўскага тэатру*

**«Волат»** (тэатар «Гулівэр», Варшава, Польшча). **Пачатак а 17-й.**

### 8 кастрычніка

*На сцэне Тэатру лялек*

**«Рамаяна»** (Трупа «Індыйскія лялечнікі», Ад'яр, Індыя). **Пачатак а 11-й, 14-й.**

*На сцэне Купалаўскага тэатру*

**«Кароткі курс беларускай паэзіі»** (Дзяржаўны тэатар лялек, Беласток, Польшча). **Пачатак а 17-й.**

**Квіткі ва ўсіх тэатральных касах Менску.**

**Даведкі: 288-24-19, 288-22-63.**

## ГАЗЭТКА ДЗЕТКАМ

# Люстраванка



**Прыдумаў Дзьмітры Дзьмітрыеў**

# Апакаліпсіс заўтра

ЛЕВЫМ ВОКАМ



Жахі і жудасьці чакаюць Эўропу на наступным тыдні, калі яна ня вызнае нашы самыя дэмакратычныя выбары. Фэльетон **Лёліка Ушкіна**.

— У вас пятае купэ, — правадніца працягнула білет пасажыру.

Пасажыр падняўся ў вагон і разваліўся на канапе. За вокнамі замільгалі краявіды Заходняй Беларусі.

Чалавек быў назіральнікам ад ЭС на выбарах, прызнаць якія дэмакратычнымі мог толькі хворы. У яго памяці зноў паўсталі падлiковыя камісіі, дзе не было ніводнага апазыцыянэра, безальтэрнатыўныя выбарчыя ўчасткі, бонзы рэжыму, якія пагражалі назіральнікам — у выпадку непрызнаньня выбараў дазволіць транзіт наркотыкаў у ЭС, перарваць пастаўкі газу, разарваць дыпляматычныя зносіны.

Тут нечакана ў купэ намалявалася жанчына сярэдняга веку.

— Цыгарэты на продаж у Польшчу не вязеш?

Не пасьпеў назіральнік раздупліцца, як цётка дастала пару блёкаў «Бонду» і сунула пад сядзеньне.

— Дзякуй. Я ў Седліцы забяру. Дарэчы, а кампанэнты для ядзернай зброі таксама не вязеш?

— Вас?

— Што «Вас»? Нашы больш за два кілаграмы ўрану вывозіць не даюць. Азьвярэла мытня!

— Вы ёсьць крэйзі?! — гэта было адзінае, што змог сказаць суразмоўца.

— Якая крэзі? Бацька дазволіў у Эўропу атамныя бомбы правозіць. Трэба было выбары прызнаваць. Дзякуй, я забяру пасьля Берасьця.

Спэкулянтка паклала на верхнюю паліцу два пакеты з надпісам «Унівэрсам Рублёўскі», якія зіхацелі як дыскатэка, і зьнікла.

У жаху назіральнік кінуўся з купэ ў калідор, дзе сутыкнуўся з правадніцай.

— Пасажыр, нічога не жадаеце? — запытала тая, блiскаючы залатой фіксай.

— А што ў асартымэнце?

— Чай, кава, гераін, какаін, марфін, вафлі, рабыні ёсьць сьвежыя. А вось клей, прабачце, скончыўся — пасажыр з трэцяга купэ ўсе цюбікі скупіў. Толькі адразу папярэджваю — нюхаць і калоцца забараняецца за 20 хвілін да прыбыцьця на канцавую станцыю. Ды што Вы так глядзіце на мяне? Вось інструкцыя на правоз у Эўропу наркотыкаў і жывога тавару ў якасьці адэкватнага адказу на непрызнаньне выбараў. Вось сэртыфікаты.

Назіральніку спатрэбілася пару хвілін, каб прыйсці да цямы і моўчкі пасунуцца ў бок туалету. Але не пасьпеў таргануць дзьверы, як з-за іх высунуўся чарнявы мужчына і на ломаной ангельскай папрасіў цішыні, таму што, разумееш, у туалеце сьпяць пяць дзетак і бабуля — і едуць яны з Бангладэшу ў Эўропу, выкарыстоўваючы зручны момант: злы пасьля выбараў на Захад Менск дазволіў транзіт нелегалаў.

— Ты можаш на вячэру барана зарэзаць, ці гэта мусім рабіць мы — твае тры жонкі? — закрычаў нехта з глыбіні памяшканьня.

Пайду я, — сказаў нелегал і зачыніў дзьверы.

Увесь астатні адрэзак шляху да Тыраспалю назіральнік прастаяў у тамбуры. Як толькі цягнік дасягнуў фарпосту Эўропы, ён кінуўся да чыгуначных кас.

— Біттэ, пані, хутчэй, білет да Менску. Яшчэ ня позна вызнаць гэтыя ідыёцішэ выбары.

— Пшэпрашам, — сказала касірка, — Але Менск, як і абяцаў, за непрызнаньне выбараў парваў усе адносіны з ЭС і цалкам пераарыентаваўся на Вэнэсуэлу і Іран. Магу прапанаваць вам білет на цягнік да Гданьску, адтуль на марскі ляйнэр да Вэнэсуэлы, дзе вы зможаце сесьці на самалёт, які ляціць у Тэгеран. А там перасесьці на менскі рэйс.

Назіральнік выцягнуў партманэ.

— Пані прымае картку Visa? Пані?..

Адказу не было. Шкло касы канчаткова зацягнулася шэранью, недзе гулка бразнуў, адламаўшыся, лядзяш: каб адпомсьціць за непрызнаньне выбараў, Менск вырубіў Эўропе газ.

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Віншуем Алену Казлову** і Валера Булгакава з нараджэньнем сына. Няхай расьце магутным! Сябры

### КАНТАКТЫ

**Паважаная «Шчырая беларуска».** Згодна з пастановай ураду пры прыёме прыватных абвестак аб знаёмствах у рэдакцыю павінны быць пададзены наступныя зьвесткі: пашпартныя дадзеныя асобы, якая падае абвестку, тэкст абвесткі, тэрмін дзеяньня абвесткі. Гэтую інфармацыю можна падаваць на электронны альбо паштовы адрас рэдакцыі.

### КУРСЫ НАРОДНАЙ ВЫШЫЎКІ

**Запрашаем** на курсы беларускай народнай вышыўкі. Заняткі з 1 кастрычніка ў памяшканьні БНТУ (ранішняя і вячэрняя групы). Т.: (029) 171–13–90 (Галіна)

### ШКОЛКА СЬВЯТОЙ ЭЎФРАСІНЬНІ

**Аб'яўляецца набор дзетак** у беларускамоўную нядзельную школку сьв. Эўфрасіньні Полацкай пры грэка–каталіцкім Душпастырскім цэнтры Сьвятога Язэпа ў Менску. Прымаюцца дзеці ад 4 да 15 гадоў. Заняткі будуць праходзіць у памяшканьні Цэнтру па вул. Арджанікідзэ, 6. Арганізацыйны сход для бацькоў 28 верасьня а 12 гадзіне. Запісацца можна праз тэлефоны: Айцец Яўген Усошын (029) 312–28–26; jusoszyn@tut.by, сястра Вікторыя Чэкан (029) 309–86–02; s.viktoryja@gmail.com

### ТАЛЬКАЎСКІ ФЭСТ

**Талькаўскі фэст** адбудзецца ў нядзелю, 5 кастрычніка. Збор у 12 гадзін каля клюбу. Падрабязнасьці на сайце www.talka.info, даведкі праз тэл. (8 01713) 71410, e–mail: talka5@tut.by

### ВЕЧНАЯ ПАМЯЦЬ

У Баранавічах у больніцы памёр старшыня мясцовага АГП, сябар нацыянальнага камітэту АГП, адзін зь лідэраў баранавіцкіх прадпрымальнікаў **Сяргей Андрушчанка**. Вечная памяць!

19 верасьня **памерла Іна Анатолеўна Карпюк**. Удава Аляксея Карпюка, дачка Анатоля Альшэўскага, сяброўка Васіля Быкава, суразмоўніца Ларысы Геніюш і Міхася Забэйды–Суміцкага. Вечная памяць!

### КНІГІ

**Прапаную кнігі**: «Беларускі кнігазбор» каля 20 кніг, часопісы «Спадчына», «Наша Ніва» 1906—1908, 1910 г, Ластоўскі, «Наша Доля» 1906, Энцыкляпэдыя Гісторыі Беларусі 1—5 т., кнігі па этнаграфіі, гісторыі, архітэктуры, мастацкія, ды іншае, багаты выбар. Т.: (029) 753–70–05

### ПРАЦА

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры, мове. Зьвяртацца загадзя. Т.: (029) 101–03–24. Юрась.

**Якасны набор**, рэдагаваньне тэкстаў на беларускай мове. Зьвяртацца загадзя. Т.: (029) 101–03–24. Юрась.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

«У Эгіпце ў магілах знайшлі жменю пшанічных зярнят. Праляжалі яны там некалькі тысяч гадоў і ўсё–ж такі, як іх пасеялі, зярняты ўзышлі і далі ўраджай. Усё, у чым толькі ёсьць пачатак жыцьця, можа ажыць, калі зложацца патрэбныя варункі; гэтак бывае і з народамі. Як вучыць гісторыя, не адзін ужо народ, каторы зваявалі насільствам, заціснулі бяспраўем, і каторы, здавалася, саўсім памёр, — разам адрадзіўся, і дух народу, прачнуўшыся ад доўгага сну, уставаў на новае жыцьцё…» Гэтак піша рускі вучоны прафэсар А.Пагодзін, і яго словы маюць вялікую цану для нас, беларусаў: мы пачынаем жыць другі раз, нанова.

**«Наша Ніва». №20. 25 верасьня 1908**

# Ня ўсё ў жыцьці апошні раз

**Каб штотыдзень атрымліваць газэту,**

дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 12 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Менск, а/с 537.

2) **Просім у блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір М.П.

## Дзякуй

**Фэліксу А.**, які цяпер у Бэрліне.
**Д.К., П.Г., Алесю З.** з Мастоўскага раёну.
**Іне С.** з Барысаўскага раёну.
**Валянціне А.** з Талачынскага раёну.
**Аляксандру П.** з Жлобінскага раёну.
**Лявонцію А.** з Полацкага раёну.
**А.Р.** з Шаркаўшчынскага раёну.
**В.А.** зь Сьветлагорскага раёну.
**Генадзю К., Сьвятлане М.** з Горадні.
**Ірыне Ц., Міхаілу К.** з Жыткавіцкага раёну.
**Міхаілу Г.** зь Берасьця.
**Вячаславу С.** з Баранавіцкага раёну.

## ЖАРТ



POLIT.RU

Наша Ніва

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф–рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша Ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.

12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 301220628001 4 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2239. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 23.00 24.09.2008.

Замова № 5264.

Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102–71.